

# ШЫРОКІ СПЕКТР ПЫТАННЯЎ

**будзе абмеркаваны падчас перагавораў на найвышэйшым узроўні ў Маскве**

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыбыў з афіцыйным візітам у Расійскую Федэрацыю.**

Самалёт з кіраўніком беларускай дзяржавы на борце ўчора вечарам прызямліўся ў аэрапорце Унукава, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА. Праграмай візіту на 15 снежня прадугледжаны перагаворы Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у вузкім і пашыраным складах. Чакаецца, што ў цэнтры ўвагі будзе шырокі спектр пытанняў двухбаковых адносін і міжнароднага парадку дня, узаемадзеяння ў інтэграцыйных аб'яднаннях. Па выніках запланавана падпісанне міжнародных дакументаў.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка ўскладзе вянок да магілы Невядомага салдата.



## Робаты загавораць і па-беларуску

СТАР. 6

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

*«На большасці валаўтваральных прадпрыемстваў краіны — каля 350 дэпутацкіх груп, якія працуюць досыць актыўна і з'яўляюцца ў пэўным сэнсе памочнікамі для адміністрацый прадпрыемстваў і адпаведных структур улады. Таму пры разглядзе бюджэту і прагнозу на 2016 год важна ўлічыць рэкамендацыі дэпутацкіх груп. Акрамя таго, на працягу года з удзелам дэпутацкага корпуса праведзена 118 рэгіянальных сходаў, дзе былі прыняты адпаведныя рашэнні. Усе яны павінны знайсці адлюстраванне пры зацвярджэнні на сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў планаў на 2016 год».*


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 СНЕЖНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 242 (28100) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


■ Аты-баты

# САМЫЯ МУЖНЫЯ СЛОВЫ



Фота Надзеі БУЖАН.

**На трасе, якая вядзе да Барысава, гэтай раніцай было нязвычна шмат аўтамабіляў. Сюды, у Печы, з усіх канцоў краіны спяшаліся тысячы людзей. Накіроўваліся яны ў 72-і гвардзейскі аб'яднаны вучэбны цэнтр падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў да сваіх дзяцей, сяброў... Каля дзвюх тысяч хлопцаў, якія былі прызваны ў лістападзе на тэрміновую службу і ў рэзерв, урачыста пакляліся верна служыць Беларусі і яе народу.**

СТАР. 3

■ Круглы стол

# ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ: ЦІ ВАРТА ПАВЫШАЦЬ?

**Размовы пра магчымасць павышэння пенсійнага ўзросту вядуцца даўно. І хаця афіцыйнай заявы аб гэтым ад Мінпрацы пакуль не гучала, рэформы, здаецца, нам не пазбегнуць. Сёння на 100 асоб працаздольнага ўзросту прыпадае 40 пенсіянераў. У будучыні дыспрапорцыя толькі павялічыцца. Дзяцей ва ўзросце 10-14 гадоў у нас каля 440 тысяч, а тых, каму засталося пяць гадоў да выхаду на пенсію, — 720 тысяч. Пры такім раскладзе відавочна, што забяспечыць усіх выплатамі будзе цяжка.**

СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Чулі?

# ЖЫВЫЯ ЗНАКІ НА ДАРОГАХ

**Фатограф Ян Хведчын і стыліст Вольга Ко пры падтрымцы гродзенскай Дзяржаўтаінспекцыі прадставілі праект «Жывыя знакі».**



У ролі мадэляў выступілі прафесійныя танцоры. Аўтары праекта замянілі сімвалы на знаках жывымі фотаздымкамі людзей, каб паказаць, што выкананне ПДР — гэта не пустая фармальнасць, а неабходнасць, якая выратоўвае жыцці.

Такім чынам яны хочуць прыцягнуць увагу грамадскасці да выканання правілаў дарожнага руху, парушэнне якіх вядзе да цяжкіх наступстваў. Толькі сёлета ў выніку аварый на дарогах Гродзеншчыны пацярпелі амаль 500 чалавек, сярод іх ёсць і загінулыя.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*prakopchik@zviazda.by*

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# МІР, БЯСПЕКА, РАЗВІЦЦЁ

## Міжнароднае супрацоўніцтва можа быць эфектыўным і ўзаемавыгадным толькі на аснове гэтых прынцыпаў

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на міжнароднай канферэнцыі «Палітыка нейтралітэту: міжнароднае супрацоўніцтва ў імя міру, бяспекі і развіцця» ў Ашхабадзе, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле слоў кіраўніка Беларусі, у сучасным свеце ўзрастае роля малых і сярэдніх дзяржаў. «Іх уклад ва ўстойлівае развіццё і захаванне міру і бяспекі ў сваіх рэгіёнах цяжка пераацаніць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Таму вельмі важна, што менавіта гэтыя словы — мір, бяспека, развіццё — з'яўляюцца дэвізам канферэнцыі. Удалы выбар. Яны ж павінны стаць і галоўнымі маякамі нашых сумесных дзеянняў на будучыню», — падкрэсліў беларускі лідар. «Перакананы, што гісторыя па заслугах ацэніць ініцыятыву кіраўніцтва Туркменістана ў правядзенні гэтага мерапрыемства, якое стане важным укладам у справу забеспячэння міру і стабільнасці на Зямлі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы, маладыя незалежныя дзяржавы, не патрабуем нічога звышнатуральнага. Неабходна адрадзіць давер у міжнародных справах, без якога немагчыма ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. А супрацоўніцтва — гэта, найперш за ўсё, дыялог, гэта ўменне пайсці на кампраміс дзеля агульнай карысці», — лічыць беларускі лідар. «Паглядзіце, што адбываецца сёння на планеце. Такое адчуванне, што свет проста звар'яцеў. Імкліва памнажаецца колькасць рэгіянальных канфліктаў, якія правакуюць маштабныя міграцыйныя крызісы. Узнікаюць цэлыя тэрарыстычныя квазідзяржавы, што нясуць пагрозу для ўсёй сусветнай супольнасці. Нават пасяховая Еўропа сёння не можа адчуваць сябе ў бяспецы. Санкцыйныя, інфармацыйныя войны даводзяцца да абсурду. Вядучыя сусветныя ігракі практыкуюцца ў ваяўнічай рыторыцы і бразганні зброяй», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Ён дадаў, што пры гэтым абсалютна не ўлічваюцца гістарычныя, культурныя асаблівасці як асобных дзяржаў, так і цэлых рэгіёнаў. «Час зразумець, што ўсе мы, вобразна кажучы, знаходзімся ў адной лодцы. Спробы ўладных людзей забяспечыць уласны дабрабыт за кошт іншых краін і народаў вядуць абавязкова ў тупік, адкуль цяжка выбірацца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Сёння ўсё залежыць ад усіх. І калі палыхне ў адной частцы свету, то імгненна адгукнецца і ў іншай», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што мэты Беларусі і Туркменістана сугучныя. «У аснове беларускай знешняй палітыкі таксама імкненне да міру, раўнапраўнага ўзаемадзеяння з усімі без выключэння партнёрамі, узаемная павага. Па сутнасці, наша шматвектарнасць у знешняй палітыцы блізкая да туркменскага нейтралітэту», — сказаў беларускі лідар. Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь, як і Туркменістан, выступае за безумоўны прыярытэт палітыка-дыпламатычных метадаў урэгулявання любых міжнародных канфліктаў, у тым ліку тых, што апошнім часам назіраюцца ў рэгіёне. «Наша краіна прыкладае максімум намаганняў для мірнага ўрэгулявання гэтых канфліктаў, і сведчаннем таго з'яўляецца канфлікт на Украіне. Мінск сёння стаў той ідэальнай нейтральнай пляцоўкай, на якой могуць вырашацца самыя сур'ёзныя пытанні. І калі ў далейшым гэта трэба мірным дзяржавам, мы гатовы адыгрываць сваю ролю», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

«Трэба пераадолець нагнятанне сітуацыі і знайсці магчымасць зрабіць для пачатку хаця б паўкроку насустрач адзін аднаму, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І праблема вырашыцца. Адноўяцца тыя добрыя, блізкія адносіны, якія былі паміж гэтымі народамі і дзяржавамі і абавязкова будуць». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў сённяшнім свеце ўсе ўзаемазвязаны.

«Калі мы дапусцілі дзесьці памылкі, трэба іх умець прызнаваць і, як гаварыў Прэзідэнт Узбекістана, прызнаўшы, знайсці ў сабе сілы пайсці на ўступкі і кампрамісы дзеля таго, каб згладзіць сітуацыю», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. «Памылкі ў гэтым бурным свеце непазбежны, і іх трэба не нагнятаць, а вырашаць. Прабачце, гэта датычыцца і апошняга канфлікту паміж нашай Расіяй і дружалюбнай нам Турцыяй», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Азіраючыся на мінулае, можна сказаць, што з распадам Савецкага Саюза ўсе постсавецкія рэспублікі ў адно імгненне апынуліся на пакутлівым раздарожжы: куды і як ісці далей. У эканоміцы панавала разруха, у палітыцы — хаос і анархія. Народ галадаў, жыў у беднасці. Задач, якія зваліліся на нас, з лішкам хапіла б на некалькі пакаленняў. Нашы краіны сутыкнуліся з шэрагам сапраўды эпахальных выклікаў: неабходнасцю правядзення найскладанейшых эканамічных пераўтварэнняў, пабудовы ўласнай дзяржаўнасці і замацавання на міжнароднай арэне», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. «Трэба было выбіраць не проста вектар развіцця, трэба было вызначаць, па сутнасці, свой лёс. І 20 гадоў таму Туркменістан прыняў, як аказалася, лёсавызначальнае для сябе рашэнне — стаць на шлях нейтралітэту», — сказаў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што Беларусь з вялікай павагай паставілася да гэтага кроку і не проста падтрымала спецыяльную рэзалюцыю Генеральнай Асамблеі ААН па гэтым пытанні, але і стала сааўтарам гэтага дакумента. Туркменістан дамогся ўражальных поспехаў у будаўніцтве суверэннай і квітнеючай дзяржавы, краіна сёння развіваецца сямімільнымі крокамі, і можна толькі белай зайздрасцю пазайздросціць гэтаму.

«Вы імкняцеся да таго, каб мір і спакой панавалі не толькі ў Туркменістане, але і ва ўсім рэгіёне. І як вынік — тысячы бежанцаў з канфліктных раёнаў у свой час знайшлі дом і прыстанішча на ўдзячнай туркменскай зямлі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. «Вы ні да кога не жадаеце далучацца. Але пры гэтым нікому не хочаце перашкаджаць жыць. Вы жадаеце жыць у міры і спакоі на сваёй зямлі і будаваць шчасце для свайго народа. Вы не ствараеце ніякіх праблем для сваіх суседзяў», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тую вялікую сацыяльную падтрымку, якая існуе ў Туркменістане, умацоўваючы веру людзей ва ўласную будучыню і будучыню роднай дзяржавы. «Вось гэта і ёсць фактычна той ідэал развіцця дзяржавы, да якога мы ўсе павінны імкнуцца. Гэта і ёсць забеспячэнне сапраўдных, а не эфемерных правоў чалавека, аб якіх так любяць сёння паразважаць некаторыя нашы партнёры», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. Ён адзначыў, што ва ўнутранай палітыцы Беларусь таксама накіравана на стварэнне эфектыўнай нацыянальнай эканомікі, годных умоў жыцця для сваіх грамадзян, эвалюцыйныя пераўтварэнні пры захаванні сацыяльнай адказнасці дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народ Туркменістана і яго Прэзідэнта з 20-годдзем нейтралітэту гэтай краіны.

■ Парламенцкі дзённік

# РЫХТУЮЦЦА ЗМЕНЫ

## ў пагадненне з Латвіяй аб прыгранічным руху

**Пра гэта паведаміў падчас сустрэчы з латвійскімі калегамі Віталь Бусько, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах. Увогуле ж, па словах парламентарыя, узровень нашых з Латвіяй эканамічных адносін заснаваны на добрай дагаворна-прававой базе.**

— Мы надаём вельмі вялікае значэнне гэтаму візіту, таму што Латвія заўсёды была для нас вельмі важным партнёрам як у эканамічнай, так і ў палітычнай сферах, — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.

Па яго словах, міжпарламенцкія адносіны Беларусі і Латвіі развіты вельмі добра.

— У нас пастаянна працуе група сяброўства з парламентам Латвіі, — паведаміў ён. — На сёння яна самая шматлікая: туды ўваходзіць 19 дэпутатаў.

Віталь Бусько звярнуў увагу на той факт, што Латвія заўсёды займала стрыманую пазіцыю, калі ў адносінах да нашай краіны прымаліся санкцыі.

— Асаблівую падтрымку з боку Латвіі мы адчулі падчас яе старшынства ў Еўрапейскім саюзе, — падкрэсліў ён. — Мы амаль падышлі да падпісання пагаднення аб спрашчэнні візавага рэжыму для нашых грамадзян. Вялікае значэнне мы надаём развіццю адносін з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора, куды ўваходзяць усе краіны прыбалтыйскага рэгіёна і членам якой з'яўляецца Лтвія.

**Ояр Калніньш, старшыня Камітэта па замежных справах Сейма Латвійскай Рэспублікі,** упэўнены: нягледзячы на тое, што нашы палітычныя погляды і падыходы могуць адрозніваецца, у краін ёсць агульныя праблемы. Па словах латвійскага парламентарыя, гэта глабальны рост тэрарызму, міграцыя і ўзброеных канфліктаў.

— Мы павінны працаваць разам над вырашэннем гэтых праблем, таму што яны могуць закрануць нашых людзей, — упэўнены Ояр Калніньш.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

17 снежня 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## РЫБАЛКА ПА ЦАНЕ ЖЫЦЦЯ

**Для двух хоцімскіх рыбакоў той дзень у прамым сэнсе слова стаў другім днём нараджэння. Нягледзячы на тое, што лёду на рэчках амаль няма, гэта не перашкодзіла сябрам пачаць сезон зімовай рыбалкі.**



Выпрабаваць свой лёс яны адправіліся на Багданаўскае вадасховішча каля вёскі Елавец-2. На адлегласці 100 метраў ад берага кволы лёд трэснуў, і рыбакі апынуліся ў вадзе. Самастойна выбрацца мужчыны не маглі і, хапаючыся за нетрывалы лёд, крычалі аб дапамозе. Калі б не праязджаў міма **камандзір аддзялення пажарнага аварыйна-выратавальнага паста вёскі Батаева Уладзімір МЯШКОЎ**, гэтая авантура магла б скончыцца для таварышаў вельмі сумна. Ён выклікаў на дапамогу калег-ратавальнікаў, якія пры дапамозе спецыяльнай дошкі выцягнулі небарак з ледзяной пасткі. З дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» яны былі шпіталізаваны.

— На жаль, гэта не адзіны выпадак, калі рыбакі рызыкуюць сваім жыццём, — адзначыла **старшы інспектар Цэнтра прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вольга НЕХАРОШЫХ.** — Таўшчыня лёду на тым жа Багданаўскім вадасховішчы была ўсяго 3-4 сантыметры. Пры разбурэнні такі лёд рассыпаецца на дробныя кавалкі, выбрацца з вады самастойна амаль немагчыма. Але, нягледзячы на ўсе нашы папярэджанні, знаходзяцца людзі, якія рызыкуюць. Хоцімскім рыбакам пашчасціла, але для кагосьці такая рыбалка можа стаць апошняй. Насцярожвае таксама, што цікавасць да небяспечнага воднага пакрыцця праяўляюць дзеці. Бацькам трэба памятаць, што адной нашай прапаганды недастаткова, каб зберагчы жыццё іх дзіцяці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ПЕНСІЯНЕР «ВАРОЧАЎ» МІЛЬЯРДАМІ

**Аператыўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама быў затрыманы мінчанін, які ажыццяўляў валютна-абменныя аперацыі, не маючы спецыяльнага дазволу і без адпаведнай рэгістрацыі. За апошнія некалькі гадоў «валютчык» незаконна набыў замежнай валюты на суму, не меншую за 109,6 мільярда беларускіх рублёў у эквіваленце. З яе толькі за два месяцы бягучага года «абарот» склаў без малога 35 мільярдаў рублёў.**

57-гадовы пенсіянер быў затрыманы аператыўнікамі пасля чарговага набыцця валюты. Падчас асабістага агляду ў яго было канфіскавана больш за 40 тысяч долараў ЗША. Было ўстаноўлена, што затрыманы неаднаразова набываў замежную валюту на бязвыплатнай аснове ў банках сталіцы ў інтарэсах розных індывідуальных прадпрымальнікаў, якія гандлююць на рынку «Экспабел» у Мінску.

Варта адзначыць, што ў мінулым годзе за ажыццяўленне незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, звязанай з правядзеннем валютна-абменных аперацый, у дачыненні да мужчыны ўжо распачыналася крымінальная справа, аднак яго вызвалілі ад крымінальнай адказнасці па амністыі, а крымінальную справу спынілі. Нягледзячы на знаходжанне ў статусе падазраванага, «валютчык» працягваў сістэматычна набываць у банкаўскіх установах на свой пашпарт буйныя сумы замежнай валюты. Пры гэтым ён нідзе афіцыйна не працаваў і не меў крыніц даходаў, суадносных з сумамі набытай валюты. Мужчына да апошняга спадзяваўся, што застанецца беспакараным. Зараз яму пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў з канфіскацыяй прадмета злачынства.

## ПАВАЖАЕШ ІНШЫХ — ПАВАЖАЕШ СЯБЕ!

**Пад такой назвай сталічная Дзяржаўтаінспекцыя правядзе 18 снежня Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху. Усе мерапрыемствы ў гэты дзень будуць скіраваны на павышэнне культуры ваджэння і ўзаемнай павагі ўдзельнікаў дарожнага руху.**

— Яшчэ ў 2011 годзе дарожная міліцыя абвясціла аб пачатку рэалізацыі праграмы «Узаемаразуменне», аднак, на жаль, у многіх выпадках дасягнуць яго паміж кіроўцамі транспартных сродкаў і пешаходамі не ўдалося, — гаворыць старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна Спадабаева. — Толькі сёлета на сталічных дарогах адбылося 263 наезды на пешаходаў (44 працэнты ад агульнай колькасці ДТЗ), у якіх загінулі 20 чалавек. Прычым, у 65 працэнтах выпадкаў былі вінаваты кіроўцы. 103 падобныя ДТЗ адбыліся з прычыны парушэнняў Правілаў дарожнага руху пешаходамі. Аднак тут варта адзначыць, што статыстыка дарожных аварый з удзелам пешаходаў не пагаршаецца, а, наадварот: з кожным годам колькасць падобных ДТЗ і загінулых у іх памяншаецца. Так, у 2011 годзе ў Мінску было зарэгістравана 527 наездаў на пешаходаў, у якіх загінулі 40 чалавек.

Аднак на тэрыторыі сталіцы па-ранейшаму адбываюцца дарожныя аварыі. І, як правіла, іх прычына часам не ў нявeданні ўдзельнікамі дарожнага руху ўстаноўленых нормаў, а ва ўзаемнай непавазе і нянавісці... На пешаходным пераходзе, які рэгулюецца, пры ўключэнні дазвольнага сігналу святлафора кіроўца павінен даць магчымасць пешаходам завяршыць пераход. Аднак бывае, што, як толькі загараецца зялёнае святло, аўтамабілі тут жа зрываюцца з месца. А пешаходы часта парабольшваюць свае правы і ігнаруюць абавязкі, мяркуючы, што на пешаходным пераходзе яны недатыкальныя. Большасць кідаецца на нерэгулюемы пераход, нават не зірнуўшы па баках...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «Я ПРАЖЫЎ У БЕЛАРУСІ ЧАТЫРЫ ПРЫГОЖЫЯ ГАДЫ»

## Папскі нунцый Клаўдыа Гуджэроцці развітаўся з беларускімі вернікамі


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Без усялякай дыпламатыі кажу, што вы, напэўна, найлепшы з паслоў Ватыкана», — словы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, з якімі ён звярнуўся да архіепіскапа Клаўдыа Гуджэроцці падчас нядаўняй асабістай сустрэчы, могуць пацвердзіць многія. За чатыры гады, якія ўсмешлівы і жыццярадасны італьянец правёў у Беларусі, ён паспеў зрабіць многае: паказаў сябе не толькі мудрым святаром, дыпламатам, але і чалавекам з добрай душой, які актыўна цікавіўся жыццём нашай краіны. Ён хадзіў з моладдзю ў пілігрымку, ускладаў кветкі ў Трасцянцы і Курапатах, вывучаў беларускую мову, наведваў дзетак у Бараўлянах, а ў памяцінным годзе перадаў Ядвізе Пастэрнак, аддананай верніцы з-пад Вілейкі, ліст ад Папы Францішка. Пры ім у нас з'явіліся чатыры новыя каталіцкія епіскапы, а непадалёк ад філармоніі пачалі ўзводзіць нунцыятуру — будынак ватыканскага пасольства. І вось такога чалавека на гэтых выхадных у архікафедральным касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі вернікі праводзілі на новае месца працы — у лістападзе яго прызначылі Апостальскім нунцыем ва Украіне.

— Гэта Бог просіць мяне пайсці ў іншае месца голасам Папы, які пасылае мяне служыць украінскаму народу, — звярнуўся да запоўненага храма Клаўдыа Гуджэроцці. — І толькі Бог ведае боль майго сэрца, тыя ўспаміны, што я забіраю з сабой. Я не хаваю гэтага ад вас. Мне вельмі цяжка пакідаць Беларусь. У маім сэрцы шмат любові і ўдзячнасці да ўсіх вас. Я пражыў тут чатыры прыгожыя гады. І кожны дзень я быў сведкам узрастання каталіцкай супольнасці.

На развітанне Клаўдыа Гуджэроцці падарылі кветкі, плед з ільну, карціну з выявай будслаўскага касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Ён наведаў гэтую святыню, куды штогод ідуць тысячы пілігрымаў, яшчэ ў пачатку сваёй працы ў Беларусі. Напрыканцы таксама вырашыў гэта зрабіць.

**Якаў ЖУРБІН.**

■ Надвор'е

# НЕПРАЦЯГЛАЕ ПАХАЛАДАННЕ

## Аднак ужо з пятніцы сіноптыкі абяцаюць чарговую хвалю цяпла

**На гэтым тыдні прагназуецца няўстойлівае надвор'е з кароткачасовымі ападкамі, пра што паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



Сёння ў нас з паўночных шырот пачне распаўсюджвацца больш халоднае паветра, што прывядзе да паніжэння тэмпературы да значэнняў, блізкіх да кліматычнай нормы снежня. «Але гэта паніжэнне не будзе працяглым», — лічыць спецыяліст. А пакуль у аўторак месцамі, пераважна па ўсходзе, пройдзе кароткачасовы снег. Раніцай у асобных раёнах магчымы туман, на дарогах месцамі галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Захаваецца зімовы характар надвор'я ў сераду і чацвер, калі месцамі пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. У асобных раёнах будзе туман, слабы галалёд, а на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў гэтыя дні складзе 2-7 марозу, а ўдзень чакаецца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, ужо з пятніцы надвор'е ізноў пачне мяняцца. Паўночнаатлантычныя цыклоны будуць рухацца да нас праз марскую тэрыторыю, таму і пачнуць прыносіць у Беларусь цёплае і сырое паветра. Чакаецца, што ў пятніцу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць ападкі (снег і мокры снег, які ўдзень пачне пераходзіць у дождж). Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1-7 градусаў, па паўднёвым захадзе будзе ад нуля да 3 цяпла. Удзень увогуле прагназуецца плюс 1-7 градусаў, а па захадзе нават 8-9 цяпла.

Дзмітрый Рабаў паведаміў, што на выхадныя ў нас вернецца позняя восень, калі ўсталюецца анамальна цёплае надвор'е, з сярэдняй тэмпературай, на 4-7 градусаў вышэйшай за кліматычную норму, а часам будзе ісці дождж. Тэмпература паветра ўначы на суботу і нядзелю прагназуецца на ўзроўні 1-7 цяпла, а ўдзень будзе плюс 2-9 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Грошы

# «ШЭРЫМ» КВАТЭРАЗДАТЧЫКАМ — ПЯЦІКРАТНЫ ПАДАТАК?

**Падатковыя органы выступаюць з ініцыятывай прадугледзець у наступным годзе больш жорсткую адказнасць за нелегальную здачу жылля ў наём. Аб гэтым паведаміла намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Эла СЯЛІЦКАЯ.**

Паводле яе слоў, для фізічных асоб, якія налета будуць здаваць сваё жыллё ў арэнду без адпаведнага афіцыйнага афармлення (а значыць, і без аплаты падатку), падатковымі органамі прапануецца прымяняць да парушальнікаў яго пяціразовую стаўку. «Падобнае новаўвядзенне зроблена для таго, каб яшчэ раз папярэдзіць іх аб неабходнасці выканання сваіх падатковых абавязацельстваў своечасова», — патлумачыла яна.

## Не пацвердзіў крыніцу даходу — заплаці 16%

Акрамя таго, налета плануецца больш сур'ёзна «біць» рублём тых, хто жыве не па сродках. Цяпер калі падатковыя органы ў выніку праверкі дэкларацый аб даходах і маёмасці вызначаць у фізічных асоб перавышэнне выдаткаў над даходамі, то грамадзяне будуць абкладацца падаходным падаткам па стаўцы 16%. Паводле інфармацыі спецыялістаў падатковай галіны, як правіла, такое перавышэнне ўзнікае за кошт атрымання даходаў ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. А паколькі для індывідуальных прадпрымальнікаў у Беларусі ўстаноўлена стаўка падаходнага падатку ў памеры 16%, то прапануецца прыраўняць да яе і стаўку для «ўхілістаў» пры выяўленні такіх даходаў.



## Інтэрнэт-гандляроў пакінуць без ільгот

Намеснік міністра таксама паведаміла, што ў наступным годзе прадугледжваюцца пэўныя меры па ўдасканаленні спрошчанай сістэмы падаткаабкладання (ССП). «Па-першае, налета пачынае дзейнічаць забарона на прымяненне ССП для плацельшчыкаў, якія займаюцца інтэрнэт-гандлем, выкарыстоўваюць інтэрнэт-пляцоўкі для размяшчэння рэкламы па продажы тавараў, работ і паслуг. Па-другое, уводзіцца абмежаванне для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць даволі сур'ёзны абарот. Цяпер гранічны памер валавой выручкі, які дазваляе ім прымяняць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, зніжаецца з 13,5 млрд рублёў да 1,5 млрд. Гэта звязана з тым, што ў ходзе праваапрымяняльнай практыкі ССП у апошнія гады кантрольныя службы заўважылі не зусім празрыстыя схемы. У першую чарчу гэта тычыцца выкарыстання рахункаў ІП пры ажыццяўленні розных незаконных схем сыходу ад падаткаабкладання.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

■ Супраць фальсіфікату

# ЕАЭС БЕЗ КАНТРАФАКТА

**На гэтым тыдні з серады па пятніцу ў Мінску пройдзе III Міжнародны форум «Антыкантрафакт-2015», які накіраваны на ўзмацненне сумеснай барацьбы з кантрафактнай і фальсіфікаванай прадукцыяй.**

Сёлета ўпершыню гэты форум будзе праходзіць не ў Расіі, а ў Беларусі. Цяпер ужо ў Мінску ўдзельнікі мерапрыемства падрабязна разгледзяць пытанні мытнага, тэхнічнага рэгулявання, фарміравання кадравага патэнцыялу, гарманізацыі заканадаўства Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі, а таксама сумеснай абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці і спажывецкага рынку.

Нагадаю, што барацьба з кантрафактам вядзецца не ў кожнай з краін саюза паасобку, а агульнымі намаганнямі ўдзельнікамі інтэграцыйнага блока. Адзіная мытная прастора абавязвае, бо калі кантрафакт трапіць у адну з нашых дзяржаў, тады пацярпець могуць усе члены ЕАЭС.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

## НЕПАГАДЗЬ ПРЫНЕСЛА ЦЕМРУ

**Мокры снег з парывістым ветрам у нядзелю пакінулі без электрычнасці жыхароў 165 населеных пунктаў. Найбольш ад стыхіі пацярпелі Брэсцкая і Мінская вобласці.**

Па стане на 13 гадзін панядзелка току не было толькі ў 38 населеных пунктах, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыйных тэхналогій «Белэнерга» Аляксандр МАЛЬКОЎ.** — Пераважна гэта невялікія вёскі. Аднаўленнем энергападачы займаліся кругласутачна больш за сто аператыўных і аператыўна-рамонтных брыгад.

У ведамстве звярнулі ўвагу на тое, што нельга набліжацца да абарванага дроту лініі электраперадач бліжэй чым на восем метраў. Акрамя таго, неабходна зараз жа паведаміць пра такую небяспечную знаходку па нумары 101.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**
*schklennik@zviazda.by*

■


Фота Надзеі БУЖАН.

# САМЫЯ МУЖНЫЯ СЛОВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сёння ва Узброеных Сілах знамянальны дзень, — звярнуўся да салдат **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.** — Ад яго вы становіцеся сапраўднымі абаронцамі нашай Радзімы. Сімвалічным з'яўляецца і тое, што ваенную прысягу вы прымаеце ў час 70-годдзя Перамогі. У нашых Узброеных Сілах дзясяткі праслаўленых злучэнняў і воінскіх часцей, узнагароджаных баявымі ордэнамі і ўганараваных найменнямі за подзвігі ў часы Вялікай Айчыннай. Сярод іх і 72-і гвардзейскі аб'яднаны вучэбны цэнтр, дзе вы праходзіце службу, атрымліваючы воінскія спецыяльнасці і спасцігаючы нялёгкую навуку перамагаць.

Міністр абароны асобна падкрэсліў, што сёння ва ўмовах шматлікіх войнаў і канфліктаў пазіцыя беларускіх улад сфармулявана дакладна — Беларусь ніколі не будзе ўцягнута ў чужыя ўзброеныя спрэчкі і заўсёды будзе абаронена ад любых замахаў:

— Для падтрымання міру і бяспекі праводзіцца шматвектарная, міралюбная знешняя палітыка, працягваецца развіццё Узброеных Сіл, якія былі і застаюцца найважнейшым фактарам стрымлівання спроб размовы з нашай краінай з пазіцыі сілы. Ізноў робяцца захады, каб зрынуць чалавецтва ў хаос. Распаўсюджванне радыкальных і экстрэмісцкіх ідэй, разгул міжнароднага тэрарызму, ахвярамі якога становяцца мірныя людзі, толькі пацвярджаюць гэтую жорсткую рэальнасць.

Словы воінскай прысягі годна гучалі на плацы. Вымаўлялі іх юнакі, якія яшчэ не так даўно былі школьнікамі, так і ўжо дарослыя людзі, якія скончылі ўніверсітэты. Бацькі са здзіўленнем пазіралі на сваіх пасталелых сыноў у ваеннай форме і са зброяй, якія здавалі перад імі сапраўдны іспыт.



— Змяшаліся пачуцці хвалявання і гонару, — гаворыць **радавы Аляксандр СІГАЙ.** — Прыехалі да мяне з Мазыра бацькі, сястра, дзяўчына... Нельга было перад імі схібіць. І ўсіх рады бачыць. Мяне ж прызвалі пасля ўніверсітэта. Чакаў яшчэ з першага курса, што павестка абавязкова прыйдзе: ваеннай кафедры ва ўстанове, дзе вучыўся, не было. Таму настройваўся на гэта вельмі даўно. Хіба вось толькі распарадак дня спачатку быў нязвычны, але паступова ўцягнуўся і ў яго. І з тымі, з кім служу, знайшоў агульную мову.

Зараз праходжу курс малодшага байца, пасля пайду вучыцца ў танкавых войскі па спецыяльнасці «камандзір танка».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ:

**Што нам дасць павышэнне пенсійнага ўзросту? Ці можна гэтага пазбегнуць? Якія фактары трэба ўлічваць пры правядзенні рэформы? Адказы на гэтыя пытанні з намі шукалі эканаміст Даследчага цэнтра Інстытута прыватызацыі і менеджмента Глеб ШЫМАНОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Ларыса БАГДАНОВІЧ, дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў ВАРОНІНА, кіраўнік навучальных напрамкаў Універсітэта трэцяга ўзросту Вольга ШЫШЛО, валанцёр-выкладчык камп'ютарных курсаў таго ж універсітэта Аляксандр ГЛУХОЎЧАНКА і намеснік начальніка ўпраўлення кадраў Мінскага аўтамабільнага завода Яўген ЗАХАРАЎ.**

## АРГУМЕНТ — НАША ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

***«Звязда»:** Якая праблема ў пенсійнай сістэме існуе цяпер? Што будзе ўплываць на прынцыпе рашэння аб павелічэнні ці захаванні ўзросту?*



Фота Надзеі БУЖАН.

**Глеб ШЫМАНОВІЧ:** На дадзены момант мы бачым, што Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва выконваецца з невялікім дэфіцытам, які пакрываецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Так, за дзевяць месяцаў бягучага года ў фонд паступіла 73,6 трыльёна рублёў, без уліку 3 трыльёнаў сродкаў з бюджэту, а выдаткі склалі амаль 79,5 трыльёна. Адпаведна праблема ўстойлівасці існуючай пенсійнай сістэмы ёсць і яна будзе толькі павялічвацца з улікам дэмаграфічных прагнозаў. Калі ў нас салідарная пенсійная сістэма (гэта значыць, што тыя, хто працуе, аплачваюць пенсіі сённяшнім пажылым), то чым менш работнікаў, тым большая на іх нагрузка. Пры росце колькасці пенсіянераў для захавання памеру пенсій неабходна павышаць падатак з заробку, які плацяць працаўнікі ў Фонд сацабароны. У выніку фінальная прадукцыя, якую мы выпускаем, стане даражэйшай. Уплыў ідзе на эканоміку ўвогуле: зніжаецца яе канкурэнтаздольнасць.



**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Асноўная задача сённяшніх пенсійных змяненняў у тым, каб умацаваць стабільнасць Фонду сацыяльнай абароны. Каб усё тое, што мы атрымліваем зараз, захавалася і не было такога, што наступіў месяц і няма чым выплаціць пенсію. Гэта, я лічу, самае галоўнае. Калі гаварыць пра карані сітуацыі, якая склалася сёння, трэба вярнуцца ў далёкія гады. Хто цяпер уступае ў працаздольны ўзрост? Тыя, хто нарадзіўся ў канцы 1990-х—пачатку 2000-х гадоў. Пачынаючы з 1996-га мы сышлі за мяжу, калі ў год нараджалася менш за 100 тысяч дзяцей. І так да 2006 года. Толькі ў 2007-м мы зноў вярнуліся на 103 тысячы. Праз нізкую нараджальнасць, што была ў сувязі з цяжкай сітуацыяй у тыя часы, мы сёння маем недахоп працаздольнага насельніцтва. Тое, што ва ўсіх суседніх краінах пенсійны ўзрост ужо даўно павышаны, не аргумент. Аргумент — менавіта наша дэмаграфічная сітуацыя.

**Глеб ШЫМАНОВІЧ:** Членства Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, дзе ў большасці дзяржаў пенсійны ўзрост вышэйшы за наш, таксама істотна не ўплывае на сітуацыю. Так, гэта мае значэнне, калі размова ідзе аб экспарце-імпарце выплат. І розніца ў пенсійным узросце, вядома, ускладняе працэс, але канцэптуальна супрацоўніцтва ў межах ЕАЭС не павінна адбіцца на пенсійнай сістэме Беларусі. У нас існуюць дамовы аб пенсійным забеспячэнні з краінамі Балтыі, дзе пенсійны ўзрост вышэйшы. Гэта справакавала некаторыя міграцыйныя плыні паміж краінамі людзей у перадпенсійным узросце, але маштабы гэтай праблемы не настолькі істотныя.

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** І эканоміка, і статыстыка паказваюць на тое, што мы мусім павышаць пенсійны ўзрост. Ці не спазніліся? Я думаю, не. У сярэднім штогод сыходзіць на пенсію (на розныя яе віды) каля 150 тысяч чалавек. Катастрафічную сітуацыю, калі недахоп працаздольнага насельніцтва будзе сур'ёзна адчувацца, эканамісты прагназуюць з 2020 года. Нават калі мы будзем павялічваць пенсійны ўзрост маленькімі крокамі, то да гэтага часу мы зможам захаваць працоўны патэнцыял, каб утрымліваць неабходную колькасць работнікаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***«Звязда»:** Цяпер сярэдні памер працоўнай пенсіі складае каля 2,9 мільёна рублёў. Няшмат. Ці дазволіць павышэнне пенсійнага ўзросту павялічыць памер выплат?*

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Да мяне на прыём часта прыходзяць незадаволеныя пажылыя, якія лічаць, што трэба павысіць пенсійны ўзрост, каб у іх стала большая пенсія. Яны гэтую рэформу разумеюць такім чынам. Але нават павелічэнне ўзросту на пяць гадоў не прывядзе да істотнага росту выплат, бо іх памер залежыць ад сярэдняга заробку па краіне. Калі ён павялічваецца на 15 працэнтаў, тады ідзе размова аб пераглядзе пенсіі. Успомніце 2011-2012 гады, калі сітуацыя была надрэнная: тады пенсія павялічвалася 4 разы на год, кожны квартал. Сёлета яна вырасла толькі адзін раз. Але і гэта было не зусім абгрунтавана, паколькі заробкі ж на 15 працэнтаў не выраслі. Наадварот, рэальныя даходы знізіліся. Хаця, напэўна, было б правільна адысці ад прывязкі пенсіі да сярэдняй заработнай платы, а карэктаваць яе з улікам інфляцыі і коштаў. Бо атрымліваецца, што сацыяльная і мінімальная пенсіі, якія залежаць ад бюджэту пражытачнага мінімуму, растуць, а працоўная — на месцы.

**Глеб ШЫМАНОВІЧ:** Ідэя індэксацыі пенсій да інфляцыі заслугоўвае абмеркавання. З пункту гледжання фінансавай устойлівасці пенсійнай сістэмы такая карэкціроўка ў найбліжэйшыя два гады нявыгадная. Яна толькі павялічыць расходы фонду. Але ў доўгатэрміновым перыядзе пераход да індэксацыі выплат да інфляцыі здольны значна зменшыць ціск на ФСАН. Адваротны бок гэтага рашэння — павелічэнне розніцы паміж заробкамі і памерам пенсій. Што да павышэння пенсійнага ўзросту, то гэта проста збалансуе сістэму. Хочам большую пенсію — трэба павялічваць заработную плату. А гэта ўжо глабальная праблема, якую Міністэрства працы і сацыяльнай абароны не вырашыць самастойна.

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** З Фонду сацыяльнай абароны, акрамя пенсій, ідзе вельмі шмат выплат: матэрыяльныя дапамогі, дапамогі на санаторна-курортнае лячэнне, бальнічныя. У тэорыі, калі б нейкую частку выплат узяў на сябе рэспубліканскі бюджэт, то, вядома ж, засталося б больш грошай на пенсіі. Але як гэта зрабіць, калі і бюджэт сфарміраваць надзвычай цяжка? Мы ў камісіі ўвесь час спрабуем знайсці тое, што можна прыбраць з фонду. Шчыра скажу: лішняга няма. Тыя ж дзесяць дапамог, якія стымулююць нараджаць больш дзяцей, у выніку ўплываюць на колькасць паступленняў у фонд, бо забяспечваюць у будучыні рост працаздольнага насельніцтва.

***«Звязда»:** Можа, варта разгледзець пераход на накапляльную пенсійную сістэму? Тады чалавек мог бы сам вырашыць: выйсці яму на адпачынак па ўзросце раней і атрымліваць маленькую суму ці адпрацаваць на некалькі гадоў больш, каб пасля ні ў чым сабе не адмаўляць.*

**Глеб ШЫМАНОВІЧ:** Апошні фінансавы крызіс у многім прымусіў задумацца аб эфектыўнасці накапляльнай сістэмы. Нават у вядучых дзяржавах. Для краін з пераходнай эканомікай, дзе фінансавыя сістэмы неразвітыя і няўстойлівыя, увядзенне такога страхавання — яшчэ больш рызыкоўны крок. Тым больш у нас неактыўна карыстаюцца гэтай магчымасцю назапашвання на старасць. Стаўкі па дэпазітах звычайна вышэйшыя, а рызыка па іх успрымаецца як меншая, таму людзям прасцей збіраць грошы на дэпазіце, чым на накапляльным рахунку.

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Пра абавязковае страхаванне цяпер не ідзе размова. Прамежак працоўнага жыцця, як правіла, 30-40 гадоў. На гэты час трэба прапанаваць бонусы, якія будуць пакрываць інфляцыйныя страты. Каб не атрымалася, як у Казахстане, калі яны зрабілі накапляльныя рахункі, а праз сем гадоў, калі людзі пачалі выходзіць на пенсіі, аказалася, што выплачваць не было з чаго. Інфляцыйныя працэсы аказаліся нашмат цяжэйшымі, чым чакалася.

Беларуская пенсійная сістэма павінна захоўвацца салідарнай. Накапляльная нам нічога не дасць, пакуль вытворчасць працы не вырасце хаця б да 50 працэнтаў да агульнаеўрапейскай. А ў наступную пяцігодку, па праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, мы плануем толькі да 45 працэнтаў яе павялічыць. Важна захаваць тое, што ёсць, каб не пагоршылася сённяшняе становішча. Таму павялічваць узрост трэба. Бо, як той казаў, выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў. Мы самі сабе павінны дапамагчы. Паменшыць колькасць людзей, якія будуць атрымліваць пенсію, і так захаваць грошы ў Фондзе сацабароны.

## УЗРОСТ МУЖЧЫН І ЖАНЧЫН ВАРТА ЗРАЎНЯЦЬ

***«Звязда»:** Закранаючы пытанні пенсійнага ўзросту, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка не аднойчы заўважаў, што павышаць узрост без згоды народа не будуць. Як людзі ўспрымаюць той факт, што працаваць, магчыма, давядзецца даўжэй?*



**Вольга ШЫШЛО:** У нас ва Універсітэце трэцяга ўзросту вучацца людзі 60+. Летась найстарэйшаму студэнту было 91 год. І з ліку слухачоў ёсць людзі, якія працягваюць працаваць на пенсіі і ў 70. Па вопыце працы за тры гады праекта, магу сказаць адно: калі жанчына ў 55 гадоў актыўная, то для яе выхад на пенсію ў такім узросце — стрэс. Паколькі ёсць сілы і жаданне працаваць, тым больш калі праца была не вельмі цяжкай фізічна. Іншы выпадак, калі ў людзей ёсць праблемы са здароўем: яны ўжо чакаюць гэтай пенсіі, каб адпачыць. А калі заробак яшчэ быў невялікім і чалавек разумее, што пенсія будзе амаль такой жа, то жаданне працаваць асабліва няма.

Мне, як спецыялісту, якому за 30, псіхалагічна лягчэй успрыняць рэформу, паколькі я зараз поўная сіл. Для мяне павышэнне пенсійнага ўзросту — гэта нармальна. А чалавеку ў 50 псіхалагічна будзе цяжка.

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Значыць, асноўную ролю ў савеце павінны адыграць асобы маладога ўзросту.



**Яўген ЗАХАРАЎ:** Маё меркаванне, што мы пакуль да павышэння пенсійнага ўзросту не гатовы. Хаця і разумеем гэтую праблему. Напэўна, рашэнне павінна быць прынята праз рэферэндум ці штосьці падобнае.

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Рэферэндум — працэдура дарагая. Ды і назавіце мне хаця б адну краіну, якая была гатова да павышэння пенсійнага ўзросту? Мне здаецца, колькі ні рыхтуйся, калі наступае момант прымаць рашэнне, ніхто не будзе згаджацца. Заўсёды хочацца адкласці гэтую змену на пазней. Хаця адзін са сцэнарыяў рэфармавання прадугледжвае, што ў людзей будзе магчымасць сысці на пенсію раней за вызначаны тэрмін. Але ў такім выпадку яны будуць атрымліваць меншыя выплаты.

***«Звязда»:** Калі павышаць узрост, то наколькі? Так, Сусветны банк рэкамендуе беларускай уладзе да 2020 года паступова падняць пенсійны ўзрост жанчын да 60 гадоў, да 2026-га давесці пенсійны ўзрост і мужчын, і жанчын да 63, а да 2030-га — да 65 гадоў.*

**Любоў ВАРОНІНА:** У мяне замежныя калегі не раз пыталіся: чаму вашы жанчыны жывуць на 10 гадоў даўжэй, а на пенсію выходзяць на пяць гадоў раней? І я не магу патлумачыць. За мяжой лічаць, што розніца ў пенсійным узросце ў 5 гадоў — дыскрымінацыя для жанчын. Мне здаецца, на нейкім этапе мужчын і жанчын давядзецца зраўняць.

**Глеб ШЫМАНОВІЧ:** Лічбы Сусветнага банка выведзены з разлікам на тое, каб збалансаваць Фонд сацабароны насельніцтва. Але павысіць узрост да 65 — сур'ёзны крок. Ён не будзе ўспрыняты станоўча. Таму, мяркую, калі павялічваць пенсійны ўзрост, то вельмі паступова. Асноўнай задачай з'яўляецца зрабіць умовы, якія будуць стымуляваць занятасць насельніцтва ва ўзросце. Што ў нас часткова ўжо існуе. Ты не прымушаеш ісці працаваць, а ствараеш умовы, калі чалавек сам хоча. Сітуацыя, калі людзі і атрымліваюць пенсію, і працуюць, не паляпшае фінансавы стан фонду, але і не вядзе яго ў мінус.

> **«Асноўная задача сённяшніх пенсійных змяненняў у тым, каб умацаваць стабільнасць Фонду сацыяльнай абароны. Каб усё тое, што мы атрымліваем зараз, захавалася і не было такога, што наступіў месяц і няма чым выплаціць пенсію».**

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Для большасці павышэнне пенсійнага ўзросту амаль нічога не зменіць. Па статыстыцы, 25 працэнтаў пажылых людзей сёння працягваюць працаваць. А калі браць першыя пяць гадоў пасля выхаду на пенсію — больш за палову. Ды і многім галінам, калі не працягваць кантракты з людзьмі пасля выхаду на пенсію, будзе цяжка. Той жа медыцыне ці адукацыі. Дзе тады браць прафесарскі склад?

**Яўген ЗАХАРАЎ:** Але ўсе сферы розныя. У нас на МАЗе з агульнай колькасці работнікаў — 18 тысяч — пенсіянеры складаюць усяго толькі 12 працэнтаў. Можа, у сферы абслугоўвання і сацыяльнай, дзе праца лягчэйшая, пенсійны ўзрост павысіць, а тым, хто заняты на вытворчасці, пакінуць сённяшні ўзровень?

**Ларыса БАГДАНОВІЧ:** Так мы вяртаемся да дыскрымінацыі. Ствараючы такую сітуацыю, мы нібыта згаджаемся з тым, што людзі, якія працуюць у прамысловасці, жывуць менш за тых, хто сядзіць у офісах. Але трэба імкнуцца да таго, каб і на вытворчасці былі ўмовы, якія не пагаршаюць здароўе. Драбніць на катэгорыі неразумна. У нас і так ёсць розныя спісы, і калі мы размяжуем насельніцтва, якое павінна дапрацаваць да поўнага пенсійнага ўзросту, яшчэ на нейкія групы, то атрымаецца блытаніна. Чым больш драбненняў, тым больш спакусаў і праблем. Таму, напэўна, дырэктыўна павінна быць вырашана: маўляў, з заўтра пенсійны ўзрост ва ўсіх будзе павышаны.

***«Звязда»:** Некаторыя баяцца, што чалавек у такім узросце — ужо не работнік. Наколькі здароўе дазваляе пажылым працаваць?*

# ЦІ ВАРТА ПАВЫШАЦЬ?



Любоў ВАРОНІНА: Цяпер назіраецца тэндэнцыя да маладосці. Параўнайце, як выглядалі людзі ў 40 паўстагоддзя таму і сёння. Нас ужо не здзіўляе, калі жанчына нараджае ва ўзросце пад 50. З аднаго боку, стан здароўя становіцца лепшым. З іншага — з'яўляюцца хваробы, якіх мы раней не ведалі. Так, у Еўропе цяпер да 40 працэнтаў людзей ва ўзросце каля 85 гадоў з хваробай Альцгеймера. Але, калі не браць складаныя выпадкі, стан здароўя дазваляе працаваць і пасля пенсіі.

Вядома, працягласць жыцця ў Беларусі меншая за еўрапейскі паказчык. Але ў той жа Швецыі, дзе людзі жывуць у сярэднім 85-88 гадоў, і пенсійны ўзрост арыентуецца цяпер на 70. Калі глядзець па класіфікацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, то малады ўзрост працягваецца да 44 гадоў, сярэдні — да 60. Абмяркоўваецца нават варыянт, каб гэтыя ўзроставыя градацыі крыху пасунуць, бо ў многіх краінах людзі і ў 70 гадоў актыўна займаюцца бізнесам, палітыкай, навукай.

**«Асноўнай задачай з'яўляецца зрабіць умовы, якія будуць стымуляваць занятасць насельніцтва ва ўзросце. Што ў нас часткова ўжо існуе. Ты не прымушаеш ісці працаваць, а ствараеш умовы, калі чалавек сам хоча».**

Ларыса БАГДАНОВІЧ: З намі неяк прафесар працаваў з Мюнхена, якому было пад 90. Ён перасоўваўся на інваліднай калясцы, з мочапрыёмнікам, але ўвесь час без праблем прылятаў да нас на самалёце.

Любоў ВАРОНІНА: І яшчэ адзін момант. Людзі, якія працуюць, адчуваюць сябе лепш. Як толькі выходзяць на пенсію, пачынаюцца хваробы. У нас пенсія чамусьці ўспрымаецца як трагедыя. Нідзе ў свеце гэтага няма. Людзі жывуць паўнавартасна, падарожнічаюць. Хваробы ж якраз пачынаюцца ад гэтага адчування безвыходнасці. Нашы пенсіянеры проста не ведаюць, чым ім заняцца. Прывыклі працаваць. Добра, калі яшчэ дзеці ёсць. А калі няма чаго рабіць, застаецца толькі хварэць. Стан здароўя найперш залежыць ад таго, што ў галаве.

## ПЕНСІЯНЕРЫ — НЕДААЦЭНЕНЫ РЭСУРС

***«Звязда»:** Павышэнне пенсійнага ўзросту закране не толькі пенсійную сістэму. Гэта комплексная праблема. Што трэба ўлічваць пры правядзенні такой рэформы?*

Глеб ШЫМАНОВІЧ: Я сфармуляваў бы праблему як павелічэнне эканамічнай актыўнасці пажылога насельніцтва. Бо павышэнне пенсійнага ўзросту зніме дэфіцыт фонду толькі на нейкі час, гэты захад кароткатэрміновы. Тэндэнцыя ж старэння насельніцтва не спыняецца. Усе інструменты, якія павялічваюць актыўнасць людзей у пажылым узросце, маюць на ўвазе пэўныя змяненні ў структуры эканомікі, пераразмеркаванне звёнаў. Напрыклад, рост сферы паслуг.

Рынак працы варта зрабіць больш гнуткім. Гэта дазволіць эфектыўней выкарыстоўваць пенсіянераў. Ёсць розныя інструменты, якія павялічваюць гнуткасць: магчымасць працаваць з дому, выходзіць на паўдня. Укараненне гэтых інструментаў на дзяржаўным узроўні павінна палепшыць сітуацыю з эканамічнай актыўнасцю людзей у пажылым узросце і, адпаведна, у нейкай ступені знізіць ціск на пенсійны фонд. А самі пажылыя, працягваючы працаваць, згладжваюць свой выхад на пенсію і могуць яшчэ крыху падзарабіць.

Ларыса БАГДАНОВІЧ: Трэба ўвязваць павышэнне пенсійнага ўзросту з сённяшняй сітуацыяй на рынку працы. Павялічваецца колькасць працаздольнага насельніцтва, а значыць, будуць патрэбныя месцы.

Глеб ШЫМАНОВІЧ: Доўгі прамежак часу ў нас асноўнай часткай беспрацоўных была моладзь. Цяпер пад уплывам розных фактараў структура беспрацоўя пачынае змяняцца. Калі ўзяць сусветны вопыт, ва ўмовах змен у эканоміцы пад уплывам крызісу ці рэформ, павялічваецца рызыка застацца без месца для людзей у пажылым узросце. Таму пры правядзенні такой рэформы трэба распачаць захады, якія дазволілі б згладзіць гэты негатыўны працэс. Хто згубіць працу ў першую чаргу? Людзі, якія жывуць у сельскай мясцовасці, з нізкім узроўнем адукацыі. Адпаведна трэба, каб сістэма сацыяльнай абароны была гатова рэагаваць на гэтыя выклікі.

Вольга ШЫШЛО: Выйсцем могуць стаць курсы па перанавучанні. Засвоіў камп'ютар — можаш быць аператарам дома. Людзей перадпенсійнага ўзросту, якія яшчэ працуюць, добра было б знаёміць з асновамі прадпрымальніцкай дзейнасці. Педагогі, псіхолагі тады могуць займацца прыватнай практыкай. У нас на курсах ёсць жанчыны, якія адпрацавалі касметолагамі: яны прапаноўваюць арганізоўваць майстар-класы па доглядзе за сабой. Тыя, хто займаецца рукадзеллем, могуць прадаваць вырабы праз інтэрнэт-краму. Ручную працу цяпер гатовы купляць. Трэба людзям арганізоўваць альтэрнатыўную занятасць. У Швецыі, напрыклад, ёсць магчымасць пенсіянерам летам уладкавацца на месца работніка, які пайшоў у адпачынак. Для пажылога чалавека гэта і стажыроўка, і падпрацоўка адначасова.

***«Звязда»:** Наколькі пенсіянер — эфектыўны работнік? І ці гатовы працадавец трымаць у сябе гэтую катэгорыю?*

Яўген ЗАХАРАЎ: Наймальнік зацікаўлены ў тым, каб пенсіянеры заставаліся на прадпрыемстве. Ад іх карысці больш, чым ад тых, хто толькі скончыў установу адукацыі. Тым больш палова моладзі хутка сыходзіць з такіх цяжкіх прадпрыемстваў, як МАЗ. Усе жадаюць працаваць у светлым халаціку, у офісах, дзе цёпла, чыста і ўтульна. І дзе заробкі большыя. Мы сёння такіх умоў прапанаваць не можам.



Аляксандр ГЛУХОЎЧАНКА: Але часта пажылому чалавеку складана ўладкавацца на працу. Для наймальніка прывабны ўзрост — максімум 45, старэйшых ужо не бяруць. Які б спецыяліст ні быў, толькі на ўзрост зірнуць — не. З такім падыходам людзі могуць на гэтыя гады да пенсіі застацца без працы. Таму часта чалавек сядзіць на адным месцы, каб хаця толькі дацягнуць да пенсіі.

Вольга ШЫШЛО: Многія з тых, хто працягвае працаваць у пажылым узросце, уладкоўваюцца не па сваёй спецыяльнасці, а ідуць на ніжэйшыя пасады.

Ларыса БАГДАНОВІЧ: Як да дэпутата, да мяне часам паступаюць звароты кшталту «я дасягнуў пенсійнага ўзросту, і са мной не працягнулі кантракт». Кіраўніцтва ў гэтай сітуацыі таксама зразумець можна. Я сама ўрач. На працы ў мяне некалі была санітарка, якой 78 гадоў. Мыць вялікія вокны ёй ўжо не паставіш, трэба кагосьці іншага шукаць. Вядома, а санітарцы ў такім узросце сказала, што час, напэўна, развітвацца. Яна была вельмі пакрыўджана, бо лічыла, што можа працягваць працаваць. Сам чалавек заўсёды сябе цэніць вышэй, чым навакольле, гэта нармальна. Таму, хто лепшы, моладзь ці пенсіянеры, пытанне спрэчнае. Рабіць наймальніка заложнікам сітуацыі і прымушаць яго яшчэ год пасля пенсіі трымаць чалавека — не варыянт. Працадавец павінен выбраць.

Яўген ЗАХАРАЎ: Мы з задавальненнем пенсіянераў пакідаем на заводзе. Праўда, да пэўнага часу і пры пэўных умовах. Рэкамендацыі ў нас такія: мужчына, з прафесійнай падрыхтоўкай найвышэйшага ўзроўню, дысцыплінаваны, да якога няма заўваг па выкананні, без размоў можа заставацца на прадпрыемстве да 65 гадоў, жанчына — да 60. Але, як правіла, жанчыны на цяжкіх працах у такім узросце ўжо не затрымліваюцца. Выбіраюць штонебудзь лягчэйшае: ідуць прыбіральшчыцамі, гардэробшчыцамі, кладаўшчыкамі, уладкоўваюцца ў камбінат грамадскага харчавання афіцыянтамі ці пасудамыйкамі. А на вытворчых участках яны працуюць максімум год-два пасля пенсіі.

У гэтым узросце работнік — вопытны спецыяліст. Але, бывае, затаржмоўваецца, не бачыць сэнсу павышаць сваю кваліфікацыю. Працуе спакойна. Лічыць, што ён ужо вышэй на галаву за маладых, якія сёння толькі прыйшлі з ліцэя. Ён выконвае тое, што ад яго патрабуюць, не праяўляючы залішняй ініцыятывы.

Вольга ШЫШЛО: Аднак многія застаюцца актыўнымі і працягваюць атрымліваць адукацыю. Сёлета ў нашым універсітэце быў трэці набор. Калі летась за два прыёмныя дні прыйшло 714 чалавек, то ў гэтым годзе — паўтары тысячы. На жаль, усіх не змаглі ўзяць. Сёння ў нас бясплатна навучаецца каля 900 чалавек. Усяго 19 напрамкаў. Самы папулярны — камп'ютарныя курсы. Замежныя мовы таксама карыстаюцца попытам. У гэтым годзе пабіты рэкорд: у нас 24 групы па англійскай мове. Ёсць тыя, хто з нуля мову вывучае. Сярод слухачоў курса па журналістыцы некаторыя ўпершыню публікавацца пачалі, для іх гэта плюс да пенсіі. Нават у расійскіх выданнях друкуюцца: паглядзелі, што ў тых часопісах ганарары вышэйшыя. На журналістыцы вучыцца зараз мужчына, які адпрацаваў на заводзе на кіраўніцкай пасадзе, але заўсёды хацеў пісаць. І цяпер у вольны час складае апавяданні.

Ёсць валанцёры з ліку саміх слухачоў. Напрыклад, замежную мову вядуць былыя педагогі. Каб не сядзець дома, раз на тыдзень прыходзяць выкладаць. Вочы гараць, ёсць жаданне працаваць, нават бясплатна. Сёлета адкрыўся цэнтр валанцёраў, дзе мы таксама прапаноўваем пенсіянерам рэалізавацца. Людзі самі вызначылі, чым яны хацелі б займацца. Сярод кірункаў — дапамога жывёлам, праца з дзецьмі, з адзінокімі пажылымі. Кампаньёнства (суправаджэнне іншага пажылога чалавека, маламабільнага, у тэатр ці краму), думаем, можа, нават выльецца ў асобны праект.

Аляксандр ГЛУХОЎЧАНКА: Сам першапачаткова хацеў запісацца на курсы як слухач. Прыцягнула тое, што да пажылых людзей аднесліся з разуменнем — стварылі ўніверсітэт. Ды і той факт, што можна вучыцца бясплатна, меў не апошняе значэнне. А ўжо калі анкету далі запаўняць, убачыў, што там ёсць графа валанцёра. Я хоць і працягваю працаваць, але вольны час застаецца. Чаму б не дапамагчы людзям? Выбраў камп'ютарныя курсы, тое, што мне больш зразумела. З задавальненнем вяду (і сам яшчэ наведваю заняткі па псіхалогіі). Бачу, як пажылыя хочуць гэтаму навучыцца, бо іх дзеці, унукі камп'ютарамі і планшэтамі карыстаюцца ва ўсю. Многія пенсіянеры ажываюць на курсах, калі бачаць, якія да іх адносіны. Яны ж разумеюць, што валанцёры з імі бясплатна займаюцца. Асабліва тым, хто ўжо не працуе, такая ўвага прыемная.

Вольга ШЫШЛО: Кіраўніцтву фірм трэба пагледзець па-іншаму на гэтую катэгорыю людзей. Летась мы ладзілі форум валанцёраў і запрашалі арганізацыі, якія ў асноўным працуюць з моладдзю. Калі яны ўбачылі актыўных людзей ва ўзросце 60+, дзякавалі, што мы іх паклікалі, бо яны нават не думалі, што пенсіянераў можна разглядаць як рэсурс у сваёй дзейнасці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ План дзеянняў

# УНІВЕРСАЛЬНЫ АГЛЯД

## Выкананне правоў чалавека ў нашай краіне абмеркавалі ў Мінску

**Сімвалічна, што міжнародны Дзень правоў чалавека, які адзначалі днямі, сумясціўся з семінарам, дзе падвялі вынікі Універсальнага перыядычнага агляду па правах чалавека ў нашай краіне. Эксперты з Міністэрства замежных спраў, Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, іншых міжнародных арганізацый, а таксама грамадскіх аб'яднанняў нашай краіны сустрэліся, каб абмеркаваць, як дзяржава будзе рэалізоўваць рэкамендацыі Універсальнага перыядычнага агляду.**

### Генсек ААН плануе наведаць нашу краіну

— У свеце няма краін, якія з'яўляюцца бліскучым прыкладам у сферы правоў чалавека, — гаворыць **Санака САМАРАСІНХА, пастаянны прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі.** — Беларусь таксама чакае вялікая праца ў гэтым кірунку. Дыялог, які распачаўся паміж урадам, няўрадавымі арганізацыямі і прыватным сектарам, азначае, што ёсць рух наперад. Распрацоўка нацыянальнага плана дзеянняў у галіне правоў чалавека стане імпульсам да далейшага развіцця, а вынік пойдзе на карысць усяму грамадству.

Як адзначыў пастаянны прадстаўнік ПРААН, наша краіна падтрымала большасць рэкамендацый УПА па эканамічных, сацыяльных і культурных правах, прычым многія рэкамендацыі накіраваны на абарону слабых катэгорый насельніцтва.

Санака Самарасінха ў сваім выступленні звярнуў увагу на тое, што Беларусь падпісала канвенцыю аб правах інвалідаў. Акрамя гэтага, па яго словах, нельга не заўважыць, як краіна клапоціцца пра бежанцаў і асоб, што прыехалі сюды з Украіны. Прадстаўнік ПРААН канстатаваў, што Беларусь можа быць у пэўным сэнсе маяком у многіх сферах. Магчыма, менавіта ўсё гэта паўплывала на жаданне генеральнага сакратара ААН Пан Гі Муна наведаць нашу краіну ў найбліжэйшай будучыні. Як паведаміў Санака Самарасінха, кіраўнік ААН можа зрабіць гэта ўжо ў наступным годзе.

### Рэкамендацыі ўлічаны

Пра вынікі другога Універсальнага перыядычнага агляду ў нашай краіне расказаў **Вадзім ПІСАРЭВІЧ, намеснік кіраўніка галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Беларусі.**

— Другі нацыянальны даклад быў падрыхтаваны ў партнёрстве з грамадзянскай супольнасцю, — заўважыў прадстаўнік МЗС. — У складзе дэлегацый былі высокапастаўленыя прадстаўнікі зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў краіны, што сведчыць аб прыярытэтнасці гэтага пытання на нацыянальным узроўні.

**У свеце няма краін, якія з'яўляюцца бліскучым прыкладам у сферы правоў чалавека**

Па выніках УПА нашай краіне было дадзена 259 рэкамендацый. Дэлегацыя адразу ж прыняла да рэалізацыі 115 рэкамендацый, да ведама — 48. Да далейшага разгляду было прынята 96 рэкамендацый, пазней з іх наша краіна пагадзілася прыняць да рэалізацыі яшчэ 53, астатнія 43 — да ведама. Такім чынам, з 259 рэкамендацый Беларусь прыняла да рэалізацыі 152, да ведама 101, часткова прыняты 6.

**ДАВЕДКА**

Універсальны перыядычны агляд па правах чалавека (УПА) — механізм Савета ААН па правах чалавека, які ўяўляе з сябе комплексны і ўсебаковы агляд сітуацыі з правамі чалавека ва ўсіх краінах свету. УПА ажыццяўляецца ў дачыненні да кожнай дзяржавы раз у чатыры гады. Беларусь прайшла гэтую працэдуру двойчы — у маі 2010 і ў маі гэтага года. Па выніках аглядаў, у якіх прымаюць удзел як краіны — удзельніцы ААН, так і няўрадавыя арганізацыі, выносяцца рэкамендацыі па магчымым далейшым прагрэсе ў галіне правоў чалавека, якія могуць быць прыняты або адхілены дзяржавамі.

Рэкамендацыі, якія беларускі бок прыняў да ведама, можна падзяліць на некалькі тэматычных груп. Адна з іх звязана з тэматыкай смяротнага пакарання ў нашай краіне.

— У адпаведнасці з нашай Канстытуцыяй, смяротнае пакаранне з'яўляецца выключнай мерай, — падкрэсліў Вадзім Пісарэвіч. — Напрыклад, яна не прымяняецца ў адносінах да жанчын, да асоб, што не дасягнулі 18-гадовага ўзросту. Асобы, якіх прыгаварылі да найвышэйшай меры пакарання, могуць звярнуцца з прашэннем да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб тым, каб змяніць пакаранне.

Пытанне смяротнага пакарання разглядае адпаведная парламенцкая група. Трэба сказаць, што, згодна з апошнімі апытаннямі, значная частка насельніцтва падтрымлівае захаванне смяротнага пакарання.

— У той жа час мы не працівімся дыялогу з усімі зацікаўленымі па гэтым пытанні, у тым ліку з нашымі заходнімі партнёрамі, і гатовы паступова рухацца да мараторыя на смяротнае пакаранне, — зазначыў выступовец. — Беларусь ніколі не галасавала супраць рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН «Аб мараторыі на смяротнае пакаранне». Такім чынам, наша краіна падтрымлівае сусветную тэндэнцыю па паступовай адмене смяротнага пакарання.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# РАМАНТЫКІ І РЭАЛІСТЫ

## ...або Ці магчыма маладым зрабіць кар'еру ў Акадэміі навук?

**«Для таго, каб пацякла рака, для яе трэба выкапаць рэчышча. Менавіта гэта мы і спрабавалі зрабіць у 2000-х гадах. Таму ў тых дабротах, якімі карыстаюцца сёння маладыя супрацоўнікі акадэміі, ёсць і частка нашых заслуг», — такую думку выказаў на «круглым стале», прысвечаным 50-годдзю стварэння Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй ХУДАЛЕЙ, загадчык лабараторыі Інстытута цепла- і масаабмену НАН Беларусі, які займаўся адраджэннем дзейнасці савета ў няпросты час.**



**Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук Сяргей КІЛІН: «Газета «Праўда» 31 студзеня 1983 года пісала, што «хоць сам Кілін яшчэ малады, ён стаў настаўнікам для моладзі...» На здымку: злева — акадэмік Ігар ВАЛАТОЎСКІ, справа — Андрэй ІВАНЕЦ.**

Пасля распаду Савецкага Саюза фундамент акадэмічнай навукі актыўна разбураўся. Гэтая сфера моладзь мала цікавіла, і на парадку дня востра стаяла пытанне з жыллём для маладых навукоўцаў і іх заробкамі.

— Нам трэба было абавязкова спыніць адток маладых кадраў за мяжу. А для гэтага мы павінны былі ім штосьці прапанаваць, каб яны мелі магчымасць самарэалізавацца на радзіме. Зацікавіць перспектыўнымі напрамкамі, шукаць міжнародных партнёраў для заключэння кантрактаў, навучыць, як сабраць пакет дакументаў і граматна падаць заяўку на грант, — узгадвае Андрэй Худалей. — Сур'ёзным дасягненнем стала ўвядзенне павышальнага каэфіцыента да заробкаў маладых вучоных. Ідэя будаўніцтва дома для навукоўцаў таксама нарадзілася з нашай падачы...

У 2014 годзе адбыўся сур'ёзны прэцэдэнт у жыллёвай палітыцы: навукоўцам было прадастаўлена дзяржаўнае арэнднае жыллё. У квартале «Магістр» кватэры атрымалі больш як 100 сем'яў маладых навукоўцаў Акадэміі навук (а размяркоўвалася сярод работнікаў акадэміі 149 кватэр). Было распрацавана і ўведзена новае Палажэнне аб парадку размеркавання жылой плошчы ў інтэрнатах Нацыянальнай акадэміі навук. У ім, у прыватнасці, прадугледжаны льготныя катэгорыі супрацоўнікаў, якія маюць першачарговае або пераважнае права на атрыманне месца ў інтэрнаце: у іх лік уваходзяць выпускнікі аспірантуры і іх сем'і, а таксама работнікі, якія маюць навуковую ступень, і іх сем'і. Сёння 100 працэнтаў аспірантаў забяспечаны інтэрнатам.

Пытанні сацыяльнай абароны маладых навукоўцаў занатаваны ў тарыфным пагадненні і калектыўных дагаворах. Маладым супрацоўнікам устанаўліваецца павышальны каэфіцыент да тарыфных акладаў у памеры не менш за 1,3.

**Намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей КІЛІН** лічыць добрым фінансавым стымулам для маладых навукоўцаў атрыманне грантаў і стыпендый. Раз на два гады ў акадэміі праводзіцца конкурс на самую лепшую першую навуковую працу сярод аспірантаў, прысвечаны Дню беларускай навукі. Штогод разглядаюцца прэтэндэнты на атрыманне стыпендыі Прэзідэнта для таленавітых маладых вучоных. У 2014 годзе больш як 40 чалавек з акадэміі сталі «прэзідэнцкімі» стыпендыятамі. Акрамя таго, упершыню летась быў праведзены конкурс на Алфёраўскую прэмію сярод маладых навукоўцаў.

Ніхто не падрыхтуе для навукі змену лепш, чым маладыя навукоўцы. Калісьці сам Кілін яшчэ школьнікам стаў аб'ектам увагі і апекі з боку маладых навукоўцаў акадэміі. «Я наведваў школу юных фізікаў пры акадэміі, затым была вучоба ў ВНУ, і з 1974 года маё жыццё непарыўна звязана з акадэміяй. Менавіта маладыя навукоўцы з'яўляюцца найлепшай агітацыяй за навуковую кар'еру для падрастаючага пакалення», — падзяліўся сваёй думкай Сяргей Кілін.

З гэтага года дзейнасць школ юных даследчыкаў у акадэміі ўзнавілася. Савет маладых навукоўцаў узяў іх пад сваё крыло. Усяго будуць дзейнічаць 13 напрамкаў гурткоў: хімічны, археалагічны, біялагічны, фізічны і іншыя...

**Старшыня Савета маладых навукоўцаў Андрэй ІВАНЕЦ** лічыць, што погляды маладых на сваю кар'еру і прафесійны рост істотна адрозніваюцца ад уяўленняў, уласцівых старэйшаму пакаленню. Без рэальнага бачання таго, што адбываецца ў свеце, развівацца дастаткова складана. Для таго, каб вынікі работы адпавядалі чаканням моладзі, неабходна максімальна выкарыстоўваць магчымасці, якія прадастаўляюцца еўрапейскай і ўвогуле сусветнай навуковай супольнасцю. Маладым вучоным трэба выязджаць за мяжу і ўдзельнічаць у розных міжнародных праектах, прэзентаваць вынікі сваёй навуковай дзейнасці на міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах. Тым больш што пры правядзенні такіх мерапрыемстваў практычна заўсёды ствараецца фонд, скіраваны на фінансавую падтрымку маладых навукоўцаў, якія прадстаўляюць на канферэнцыі найбольш цікавыя вынікі.

— Моладзі патрэбна ўсё і адразу. Мець навуковыя амбіцыі — гэта нармальна, — упэўнены Андрэй Худалей. — Для маладых навукоўцаў не існуе бар'ераў, якія перашкаджаюць старэйшаму пакаленню.

Зараз Савет маладых навукоўцаў заканчвае распрацоўку палажэння аб Маладзёжнай акадэміі навук. Максімальная колькасць яе дзейных членаў складзе не больш за 30 чалавек. Гэта прадыктавана вельмі высокімі патрабаваннямі пры выбары кандыдатаў. Цяпер у акадэміі працуюць больш як 2,1 тысячы маладых навукоўцаў, з іх каля 300 з'яўляюцца кандыдатамі навук. Але не кожны кандыдат навук у стане кіраваць хай і невялікім, але сваім даследчым калектывам. Стаць членам Маладзёжнай акадэміі навук будзе адначасова і прэстыжна, і адказна. Правадзейным членам Маладзёжнай акадэміі штогод будуць выдзяляцца гранты на навуковыя даследаванні. Яны змогуць накіроўваць іх «у тым ліку і на фінансаванне студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, якія будуць працаваць у рамках іх навукова-даследчых груп», а таксама на павышэнне сваёй навуковай кваліфікацыі — замежныя стажыроўкі, удзел у міжнародных школах маладых навукоўцаў, канферэнцыях.

Напрыканцы кожнага года ўсе будуць рабіць справаздачу аб праведзенай працы на агульным сходзе. Таму, калі ты сёння член Маладзёжнай акадэміі, то не факт, што праз год ім застанешся.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*nikalaeva@zviazda.by*

■ Погляд у будучыню

# БЯЗМЕЖНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ

**Нядаўна ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук адбылася прэзентацыя Міжведамаснага даследчага цэнтра штучнага інтэлекту. Што цікава, працуюць у гэтым напрамку не толькі спецыялісты ў камп'ютарнай тэхніцы. Без прыцягнення навукоўцаў іншых профіляў, у прыватнасці біялагічнага, не абысціся. Менавіта таму цэнтр і мае статус міжведамаснага.**



— Наша праграма ўмее лакалізоўваць вузлавыя ўтварэнні ў лёгкіх чалавека, — расказвае **малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі матэматычнай кібернетыкі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Эдуард СНЯЖКО.** — Прычым робіць гэта лепш, чым доктар: чалавеку прыходзіцца штодзень разглядаць вынікі аналізаў некалькіх дзесяткаў чалавек, вядома, вока «замыльваецца», нешта можа не трапіць пад яго ўвагу. Наша распрацоўка робіць аналагічную працу хутка і вельмі якасна. Калі новаўтварэнні яшчэ невялікія, гэта можа ўратаваць чалавеку жыццё. Праграма апрацоўвае вывы лёгкіх, атрыманыя пры дапамозе камп'ютарнай тамаграфіі, у трох праекцыях.

Распрацоўку ўжо выкарыстоўваецца ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, а таксама ў РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі. На рэалізацыю пайшло тры гады. Як тлумачыць адзін з аўтараў, беларускае абсталяванне не горшае за замежнае, а па некаторых аспектах і пераўзыходзіць яго.

Яшчэ адзін медыцынскі праект — праграма, якая ўмее сегментаваць групы мышцаў ног на аснове вынікаў магнітна-рэзананснай тамаграфіі. Як тлумачыць **малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі матэматычнай кібернетыкі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Аляксей ШУКЕЛОВІЧ**, яна стварае аб'ёмную мадэль, што дазваляе адсочваць дынаміку змянення аб'ёму асобных цягліц. Такая праца патрэбна, калі праводзіцца маніторынг пацыентаў з мышачнымі дыстрафіямі. Урач можа максімальна хутка вылучаць асобныя мышцы і пасля сачыць толькі за імі. Калі рабіць сегментацыю ўручную, патрэбна прыкладна чатыры гадзіны, камп'ютар жа выконвае працу імгненна.

...Металічны голас агучвае ўрывак з «Новай зямлі» Якуба Коласа. Так працуе сістэма сінтэзу беларускага маўлення, распрацаваная **малодшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення інстытута Станіславам ЛЫСЫМ і стажоркай Ганнай СТАНІСЛАВЕНКАЙ.**

— Наша распрацоўка можа быць выкарыстана ў самых розных сферах, дзе патрэбен голас чалавека, — кажа Ганна. — Напрыклад, пры абслугоўванні людзей з дрэнным зрокам. Сістэма працуе ў маладзечанскай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку. Агучка прыпынкаў у транспарце — яшчэ адна сфера магчымага ўжывання.

**«Справіцца з дзяржаўным кіраваннем без шырокага прыцягнення камп'ютарнай тэхнікі сёння немагчыма, — мяркуе навукоўца. — У нас ужо ёсць лакальныя часткі сістэмы электроннай дзяржавы, і цяпер галоўная задача — звязаць іх у адно цэлае».**

Замест таго, каб асобна запісваць кожную фразу дыктара, можна даверыць справу камп'ютару, які зробіць усё за колькі секундаў. Акрамя таго, сістэма працуе і ў адваротны бок — можна навучыць машыну распазнаваць чалавечы голас, каманды. Яшчэ працуем над галасавым інфарматарам — камп'ютар зможа абазвяць людзей і пра нешта ім паведамляць. Гэта можа быць карысна для самых розных устаноў, скажам, паліклінік.

Запісаць новы варыянт голасу машыны, па словах Станіслава, няцяжка. Для гэтага трэба начытаць на мікрафон каля тысячы загадзя падабраных слоў — такі набор апісвае ўсе спалучэнні гукаў у беларускай мове.

— Наша распрацоўка можа патлумачыць, на якія моманты чалавек звяртае ўвагу пры знаёмстве з любым прадметам, — распавядае **студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Павел ХВАШЧУК.** — Яна адсочвае ключавыя пункты, на якія глядзіць карыстальнік. Робіцца гэта рознымі шляхамі, у прыватнасці выкарыстоўваем паліграф для аналізу ўсплёскаў мазгавой актыўнасці. Такім чынам можна патлумачыць псіхалагічныя матывы, якімі чалавек кіруецца, напрыклад, пры выбары якога-небудзь тавару. Таму распрацоўку можна ўкараніць у сферы маркетынгу.

Акрамя прэзентацыі Міжведамаснага даследчага цэнтра штучнага інтэлекту, у інстытуце прадставілі напрацоўкі Цэнтра тэхналогій электроннай дзяржавы, які таксама ствараецца. Па словах **першага намесніка старшыні Прэзідыума НАН Сяргея ЧЫЖЫКА,** ужо на працягу наступных пяці гадоў у Беларусі будзе зроблены вялікі крок да рэалізацыі канцэпцыі электроннай дзяржавы. «Справіцца з дзяржаўным кіраваннем без шырокага прыцягнення камп'ютарнай тэхнікі сёння немагчыма, — мяркуе навукоўца. — У нас ужо ёсць лакальныя часткі сістэмы электроннай дзяржавы, і цяпер галоўная задача — звязаць іх у адно цэлае».

— Прыблізна тры гады таму Савет Рэспублікі ініцыяваў стварэнне аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Мясцовыя саветы дэпутатаў», — дзеліцца **галоўны канструктар праекта Віктар ТРУСАЎ.** — Мы зрабілі такую сістэму, яна паспяхова працуе па ўсёй краіне. Сутнасць у тым, што ў любы момант органы ўлады могуць атрымаць самую розную аператыўную інфармацыю з рэгіёнаў. Гэта і дэмаграфічныя паказчыкі, і эканоміка, і сфера зямельнага карыстання, прыватных гаспадарак і многае іншае. Такім чынам, прымаючы рашэнне, органы ўлады маюць магчымасць без усялякіх папер максімальна хутка прааналізаваць усе лічбы і, магчыма, скарэкціраваць нейкія прапановы і ўказанні.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*lyskavets@zviazda.by*

■



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Сітуацыя

# МАЛОЧНЫ «РЭБУС»

## Што з пастаўкамі нашай прадукцыі ў Расію?

**Летась мне ўдалося пабываць у Вялікім Ноўгарадзе ў складзе дэлегацыі, якую знаёмілі з мясцовымі прадпрыемствамі. Тады мяне вельмі здзівіла, што расійскія чыноўнікі арганізавалі незапланаваны паход па наўгародскіх крамах, дзе беларускія прадстаўнікі змаглі азнаёміцца з асартыментам. У малочным аддзеле маленькай расійскай крамы была вялікая разнастайнасць беларускіх сыроў, малака, тварагу. У гіпермаркеце ўбачыў тую ж карціну, толькі ў больших аб'ёмах. Наша прадукцыя сапраўды карыстаецца вялікім попытам у Расіі, ды і самі жыхары кажуць, што беларускай «малочкі» ім часта не хапае.**

### Якасць на ўзроўні

Паводле звестак цэнтра вывучэння малочнага рынку The DairyNews, у Расіі ёсць дэфіцыт таварнага малака. У 2014 годзе ён склаў 7,2 млн тон. Акрамя таго, пры росце вытворчасці малака трывожнай застаецца тэндэнцыя скарачэння спажывання малочных прадуктаў. Свежыя даныя Міжнароднай малочнай Федэрацыі (IDF) дэманструюць скарачэнне спажывання малочных прадуктаў у Расіі ў 2013 годзе да 161 кг на душу насельніцтва ў параўнанні на сырое малако.

Сёлета ў сярэдзіне кастрычніка спецыялісты Мінсельгасхарча і Рассельгаснагляду праводзілі маніторынг малочных прадпрыемстваў нашай краіны. Беларускі бок пры гэтым зрабіў усё магчымае, каб нашы суседзі наведалі ўсе прадпрыемствы, што іх зацікавілі, бо галоўнай мэтай была праверка выканання неабходных ветэрынарна-санітарных патрабаванняў, што важна для ўсіх. Тады ў канцы кастрычніка расійскія калегі не выказалі істотных нараканняў на працу беларускіх малочных прадпрыемстваў. **Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід ЗАЯЦ** адзначыў, што малочныя прадпрыемствы нашай краіны з гонарам вытрымалі праверку.

### Магчымы фальсіфікат?

Ужо ў сярэдзіне лістапада ў расійскіх СМІ з'явіліся паведамленні, што, паводле інфармацыі, атрыманай у ходзе інспекцыі чарговых беларускіх прадпрыемстваў, Рассельгаснагляд праінфармаваў ветэрынарную службу Беларусі аб неабходнасці ўвесці часовыя абмежаванні на пастаўкі прадукцыі 5 прадпрыемстваў па вытворчасці гатовай малочнай прадукцыі. Ужо 25 лістапада ў Маскве адбыліся перамовы, падчас якіх расійскаму боку былі перададзены матэрыялы аб прынятых мерах у дачыненні да айчынных малочных прадпрыемстваў. На іх правялі работу згодна з патрабаваннямі Расійскай Федэрацыі. Нашы спецыялісты адзначылі, што цяпер кожная партыя малочнай прадукцыі, якая пастаўляецца на тэрыторыю Расіі, падвяргаецца татальнаму лабараторнаму маніторынгу.

Раней пяць беларускіх малочных прадпрыемстваў («Мілкавіта», Рагачоўскі МКК, Слуцкі сыраробны камбінат, малочная кампанія «Навагрудскія дары» і «Смаргонскія малочныя прадукты», філіял Лідскага малочна-кансервавага камбіната) абвінавацілі ў выкарыстанні сыравіны з прадпрыемстваў трэціх краін, а таксама ў тым, што не забяспечваўся належны дзяржкантроль за прадукцыяй, выяўляліся выпадкі падробкі ветэрынарна-санітарных дакументаў. Аднак падчас сустрэчы беларускі бок агучыў сваю занепакоенасць у вераготнай фальсіфікацыі прадукцыі на тэрыторыі Расіі пад вядомымі беларускімі брэндамі. У прыватнасці, адзначана, што ў некалькіх выпадках выяўлення Рассельгаснаглядам тых ці іншых парушэнняў у прадукцыі, якая паступіла з тэрыторыі Беларусі, унутранае расследаванне паказала, што такая прадукцыя не паступала ва ўказаны ведамствам рэгіён Расіі. Гэта, у сваю чаргу, можа быць вынікам выкарыстання нядобрасумленнымі вытворцамі імя вядомых беларускіх брэндаў.

### Найбуйнейшы імпарцёр

Паводле інфармацыі **начальніка галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча Аляксея БАГДАНАВА**, цяпер прыпынення паставак пяці беларускіх прадпрыемстваў не адбылося. А ўвогуле, па інфармацыі Нацыянальнага саюза вытворцаў малака «Саюзмалако», змен на рынку малочнай прадукцыі не прагназуецца. Беларусь па-ранейшаму застаецца найбуйнейшым імпарцёрам на расійскім малочным рынку і ў найбліжэйшы час захавае гэты статус. І гэта нядзіўна. Напярэдадні міністр спажывецкага рынку і паслуг урада Маскоўскай вобласці Уладзімір Пасажэнікаў на чацвёртай гандлёвай сесіі Падмаскоўя адзначыў, што беларускія прадукты добра знаёмыя жыхарам Маскоўскай вобласці, а сыры, масла, тварог, малако, кефір, ражанка, мясныя вырабы нашых вытворцаў карыстаюцца нязменным попытам дзякуючы высокай якасці.



### Інданезійскі вектар

А тым часам, пакуль у Расіі вырашаюць, што ж рабіць з нашым малаком, беларуская прадукцыя працягвае заваёўваць сусветны рынак. Эксперты ветэрынарнай дзяржаўнай службы Інданезіі далі высокую ацэнку якасці беларускіх малочных прадуктаў. Па выніках праверкі камісія склала справаздачу ў Міністэрства сельскай гаспадаркі з рэкамендацыяй адкрыць Беларусі магчымасць паставак малочнай прадукцыі ў Інданезію. Гэта не новы рынак для Беларусі, але для таго, каб выйсці на яго з малочнай прадукцыяй, беларускія спецыялісты працавалі на працягу некалькіх гадоў. Паводле папярэдніх разлікаў, беларускія прадпрыемствы могуць штогод пастаўляць у Інданезію каля 10 тыс. тон сухіх малочных прадуктаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Узровень

# ДЗЕ БРОДЗІЦЬ СУЧАСНАЕ ПІВА

## «Лідскае» завяршыла мадэрнізацыю, распачатую ў 2008-м

**Міжнародны канцэрн Olvi Oyj (Фінляндыя) выдаткаваў на гэта звыш 80 млн еўра. Такім чынам, завяршыўся самы паспяховы інвестыцыйны праект у айчыннай харчовай прамысловасці за апошнія гады. Завод стварыў выдатны плацдарм для найдалейшага абнаўлення і развіцця па прыкладзе лепшых еўрапейскіх стандартаў.**



Мадэрнізацыя закранула ў першую чаргу водападрыхтоўку. «Сама вада здабываецца з дзвюх уласных свідравін глыбінёй 280 м — яны забяспечваюць усе патрэбы завода, — тлумачыць **галоўны півавар «Лідскага піва» Дзмітрый НІЧЫПАР.** — Усё ж такі тут выпускаецца і піва, і пітная вада, і некалькі відаў салодкіх напояў кампаніі Pepsi. Такая сур'ёзная кампанія адпаведным чынам ставіцца да вырабу сваёй прадукцыі ў іншых краінах, а таму ўзоры той пітной вады, што пойдзе на выраб «Пепсі», «Сэвен Ап» і «Мірынды», давялося дасылаць на экспертызу ў ЗША. Напоі патрабуюць самай мяккай вады, без жалеза і соляў. Для пітной жа вады «Аўра», напрыклад, цалкам выдаляць солі нельга. А для «піўной» вады — наогул свае патрабаванні». Трыа розных фільтраў — гэта ўнікальна для нашай краіны. Адным словам, самая сучасная ў Беларусі і суседній Прыбалтыцы сістэма водападрыхтоўкі — на «Лідскім піве».

Аднак для вырабу піва толькі добрай вады недастаткова. Быў пабудаваны новы варачны цэх, у якім усталявана нямецкае абсталяванне. У новай варніцы можна ажыццяўляць 12 варак за суткі па 45 тысяч літраў за адну варку. Абсталяванне энергаэфектыўнае і экалагічнае. Лічыцца, што ў варніцы забяспечваецца 80 працэнтаў якасці і смаку будучага напою. Для гатавання сусла выкарыстоўваюцца розныя сарты хмелю — ад горкіх да духмяных. Дарэчы, у продажы ёсць нават від піва, які ў Лідзе вараць з аўстралійскага хмелю. Наогул тут даўно практыкуюць выраб невялікіх партый «аўтарскага» піва.

Самае важнае далей — кампазіцыя цукраў, якія праявяць сябе на наступнай стадыі, у браджэнні. Пачынаецца яно з дадаваннем дражджэй. Дарэчы, набываюцца яны ў Германіі і каштуюць нямала. Працэс ператтварэння сусла ў піва можа цягнуцца 5-7 сутак, а для некаторых сартоў піва патрабуецца і 14-15, і нават 18-22 дні.

Новае дражджавое аддзяленне дазваляе сёння вырабляць піва па новых тэхналогіях. У цэху браджэння ўсталявана шэсць цыліндра-канічных танкаў на 330 куб. м (*на фота*). А ўсяго на прадпрыемстве — 28 «танкаў» для піва і квасу, уключаючы міні-«танк» для вырабу эксперыментальных, невялікіх партый крафтавага піва.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара ААТ «Лідскае піва» Аўдрыуса МІКШЫСА**, цягам усёй сваёй 140-гадовай гісторыі існавання прадпрыемства ніколі не здраджвала выпуску хмельнага напою. Абнаўленне закранула ўсе працэсы вытворчасці. Аднак спадар Мікшыс дбае не толькі аб будучыні завода, але і аб захаванні мінулага. Таму ў планах — рэканструкцыя адной з заводскіх пабудоў XIX стагоддзя. Яна размешчана якраз на тэрыторыі завода, некалі побач пралягала адна з гарадскіх брукаваных вуліц, якую таксама будуць аднаўляць. Магчыма, удасца арганізаваць і музей гісторыі півавараення Беларусі, і сувенірны гандаль для ўздзельнікаў экскурсій. Пры такім раскладзе паглядзець, што такое сучасны выраб піва, змогуць не толькі журналісты, а ўсе ахвотныя, уключаючы саміх лідчан, якія, магчыма, і не здагадваюцца, адкуль бярэцца іх роднае «Жыгулёўскае спецыяльнае».

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# ТЭРМІН ДЛЯ ЗАПЧАСТАК

**У Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі ў сярэдзіне снежня разгледзяць пытанне аб падаўжэнні тэрміну рэалізацыі рэштак аўтазапчастак. Паводле інфармацыі прэс-службы ведамства, у апошні час паступае нямала адпаведных зваротаў ад прадпрымальнікаў. Гэты момант будзе абмяркоўвацца на пасяджэнні рабочай групы па праблемных пытаннях у сферы тэхнічнага рэгулявання, прымянення санітарных, ветэрынарных і фітасанітарных мер ва ўмовах ЕАЭС.**

Вядома, што ў адпаведнасці з тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза «Аб бяспецы колавых транспартных сродкаў» быў вызначаны спіс аўтазапчастак, якія да выхаду на рынак ЕАЭС павінны былі прайсці працэдуры пацвярджэння адпаведнасці патрабаванням бяспекі. Да такіх працэдур адносіцца сертыфікацыя або дэкларыраванне адпаведнасці самім вытворцам ці яго афіцыйным прадстаўніком альбо імпарцёрам.

Для аўтамабільных запчастак, якія сертыфікавалі да ўступлення ў сілу ТР МС 018/2011, маецца на ўвазе да 1 студзеня 2015 года, быў прадугледжаны пераходны перыяд да 1 ліпеня 2016-га. У дачыненні да кампанентаў, на якія такія дакументы адсутнічаюць, пераходны перыяд першапачаткова не быў устаноўлены, а значыць, з 1 студзеня сёлета яны павінны былі знікнуць з продажу. Улічваючы, што ў Беларусі абавязковаму пацвярджэнню адпаведнасці падлягала нязначная колькасць відаў аўтазапчастак, Дзяржстандарт, згодна са сваімі паўнамоцтвамі, таксама ўстанавіў для іх пераходны перыяд, але да 1 студзеня 2016 года. Аднак у апошні час у ведамства паступаюць звароты ад арганізацый бізнесу аб падаўжэнні гэтага тэрміну.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Краязнаўчая скарбонка

# «УСЁ ЯГО ЖЫЦЦЁ — ГЭТА ЦУД»

## На беларускую мову перакладзена кніга пра Эдварда Вайніловіча

**Асоба Эдварда Вайніловіча цяпер стала для нас яшчэ больш блізкай. З'явілася дакументальная аповесць, прысвечаная гэтаму выдатнаму чалавеку. Яе напісала польская журналістка Гізэля Хмялеўская на падставе рэальных дакументаў, якія ёй удалося адшукаць. А зусім нядаўна перакладзеная на беларускую мову Валерыяй Ждановіч кніга «Церні крэсаў» пабачыла свет у нашай краіне.**

*«...Ён мог нарадзіцца і ў Савічах — на зямлі, якая з 1661 года заставалася ў руках Вайніловічаў герба «Сыракомля». Там, дзе быў бацькоўскі палац, мноства памятак звязана з мінуўшчынай яго роду. Але бабуля і дзед з матчынага боку — Міхаліна з роду Манюшак і Эдвард Ванькові́ч — абавязкова хацелі, каб першы ўнук прыйшоў на свет у іх доме ў Вялікай Сляпянцы. Яно і лепш, што так выйшла, бо сёння ад колішняй рэзідэнцыі ў Савічах, па сутнасці, не засталося ані следу. Купка старых дрэў, руіны гаспадарчых будынінаў і сціплыя рэшткі палацавых муроў пакрытыя прэлай саломай, па якой блукаюць задуменныя каровы...»* — такімі словамі пачынаецца ўступная частка «Церняў крэсаў», якую для прысутных на прэзентацыі выдання агучыў артыст Беларускай нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, самы вядомы «дылетант» краіны Юрый Жыгамонт. Так, месцамі наша мінулае занядбана, аднак веды пра яго дапамагаюць аднавіць рэальную карціну, якой, часцей за ўсё, можна ганарыцца.

**Мала хто зрабіў столькі ж, каб крыніца беларускасці зноў пачала бруіцца.**

Беларускае перавыданне «Церняў крэсаў» прайшло няпросты шлях. На ім яго падтрымліваў Польскі інстытут у Мінску. Натуральна, найперш апекаваўся кнігай выдавец Віктар Хурсік, які адзначыў, што кожнае выданне для яго — нібы выняньчанае дзіця, і «Церні крэсаў» — не выключэнне. Натуральна, праз сэрца прапусціла кнігу і **перакладчыца Валерыя ЖДАНОВІЧ:**

— Справа беларускага перавыдання гэтай кнігі напачатку выглядала проста рамантычнай задумай. Аднак мала хто зрабіў столькі, як Эдвард Вайніловіч, каб крыніца беларускасці зноў пачала бруіцца. Таму ў нас усё атрымалася... Менавіта Вайніловіч заснаваў банк і даваў грошы простым людзям, каб спраўдзіць іх мару аб уласнай зямлі. Ён быў тым чалавекам, які адчуваў бацькоўскую прагу апекі над тымі, каму мог дапамагчы, і шчодра адарыў іх гэтым. Шмат рабіў, напрыклад, для бедных шляхецкіх сем'яў, якія апынуліся ў палоне ліхвяроў: даваў пазыкі, каб дапамагчы далей існаваць годна. Вайніловіч развіваў мясцовую сельскую гаспадарку, бо бачыў у ёй самыя глыбокія карані нацыянальнага жыцця. Трагедыя гэтага чалавека звязана з асабістым горам — стратай любімых дзяцей. Але пасля адбылася яшчэ і ломка яго светапогляду: ірацыянальныя сілы пачалі бурыць усё, што ён будаваў. Вымушанае перасяленне прывяло да таго, што ён апынуўся далёка ад роднай зямлі, не мог нават памаліцца ў тым касцёле, які ўзводзіў у гонар сваіх дзяцей... Сёння часта разважаюць пра тое, ці святы Эдвард Вайніловіч? Думаю, так. Усё яго жыццё — гэта цуд. А найвялікшы цуд — тое, што касцёл у гонар святых Сымона і Алены ў сталіцы захаваўся, нягледзячы ні на якія катаклізмы.

Сапраўды, нават калі памяці пра Эдварда Вайніловіча сучаснікі ўдзяляюць мала ўвагі, касцёл Сымона і




Алены ў Мінску велічна ўздымаецца над плошчай Незалежнасці. Яго чырвоны колер быццам нагадвае пра палымянае сэрца свайго фундатара, які не стамляўся любіць — сваіх дзяцей, сучаснікаў, Радзіму, мову...

Пра еднасць Вайніловіча і беларускай сталіцы гаварыў і **галоўны архівіст Нацыянальнага гістарычнага архіва Уладзімір ДЗЯНІСАЎ:**

— Аўтарка кнігі падкрэсліла, што асноўнай рэзідэнцыя Вайніловіча былі Савічы. Аднак ён быў звязаны з Мінскам. Па-першае, тым, што нарадзіўся ў маёнтку Вялікая Сляпянка. Паядналы яшчэ і таму, што яго хрысцілі менавіта тут. У Нацыянальным гістарычным архіве захавалася актавая кніга Мінскага кафедральнага касцёла, дзе маецца запіс пра гэта. Я думаю, што Эдвард Вайніловіч прыязджаў сюды (хаця адпаведных успамінаў не захавалася), бо гэта была мінская летняя рэзідэнцыя яго самага блізкага сваяка Ваньковіча, якому належала Сляпянка... Гізэля Хмялеўская, дзякуючы сваёй энергіі, па кавалачках сабрала сямейныя архівы Вайніловіча, якія разышліся па ўсёй Польшчы. Многія прафесійныя гісторыкі займаліся вывучэннем гэтай постаці, пісалі пра яго, аднак такой працы зрабіць не здолелі. Вайніловіч вяртаецца на Беларусь, бо гэтая кніга, перакладзеная на беларускую мову, стала даступнай для ўсіх, хто цікавіцца нашай мінуўшчынай.

Дарэчы, сама Гізэля Хмялеўская падзялілася думкай, што ў Мінску варта было б належным чынам ушанаваць асобу Вайніловіча — назваць яго імем адну з вуліц.

**Прафесар, доктар філалагічных навук Адам МАЛЬДЗІС** на прэзентацыю выдання, як заўсёды, прыйшоў не з пустымі рукамі, а з сенсацыяй у запасе:

— У кнізе апісана гісторыя мястэчка Юравічы цяперашняй Гомельскай вобласці — таго, што там былі касцёл, затым — праваслаўная святыня. Калісьці адна мясцовая магнатка па прозвішчы Горват узяла абраз Маці Божай і падпольна перадала ў Кракаў. У 1934 годзе ён быў выстаўлены ў касцёле Святой Барбары. Я нескі завітаў туды, каб, па-першае, паглядзець на сам абраз, па-другое, падумаць, як можна зрабіць гістарычны абмен — арыгінал вярнуць у Юравічы, а копію — перадаць у Польшчу. Святар выслухаў мяне ўважліва... Аказваецца, у гістарычных дакументах пазначана і апублікавана, што гэтая ікона была перададзена туды ў дэпазіт. Таму вяртанне яе бачыцца сапраўды рэальным.

Аднак ёсць і тое, што крыху бянтэжыць у «Цернях крэсаў». Здзіўляе даследчыкаў і проста ўважлівых чытачоў сама назва выдання, дзе ўжыта слова «крэсы» (ускраіны. — **Аўт.**). Беларусь — больш не ўскраіна. Гэта самастойная краіна, якая ні ад кога не залежыць. З такой думкай згодны як прафесар Адам Мальдзіс, так і **дацэнт, кандыдат гістарычных навук гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Віталь МАКАРЭВІЧ**, які патлумачыў:

— Эдвард Вайніловіч у сваіх успамінах, якія пісаў ужо ў 1920-х гадах, ужываў выраз «крэсы беларускія, нашы крэсы». Аднак на той час тэрыторыя сучаснай Беларусі — былога Вялікага Княства Літоўскага — была не актыўным, а пасіўным удзельнікам падзей. Нас разарвалі на часткі, і мы ў пэўным сэнсе былі ўскраінай іншых палітычных утварэнняў. Аднак сённяшнія беларусы тэрмін «крэсы» ўспрыняць не могуць. І дыпламатычна, і метадалагічна гэта не вельмі правільна ў дачыненні да Беларусі. Вайніловіч нарадзіўся на Літве, або Русі, у 1920-я гады гэта зямля стала «крэсамі», аднак сёння — гэта Беларусь, Украіна і Літва.

**У Нацыянальным гістарычным архіве захавалася актавая кніга Мінскага кафедральнага касцёла, дзе ёсць запіс пра хрышчэнне Эдварда Вайніловіча.**

Варта дадаць, што асоба Эдварда Вайніловіча сёння набывае ўсё большую папулярнасць. На рускай мове выйшлі яго мемуары, якія з задавальненнем чытаюць самыя розныя людзі, зацікаўленыя дзейнасцю слыннага папяроўніка. На Капыльшчыне плануюць стварыць маршрут «Шляхамі Вайніловіча». У Чырвоным касцёле каштоўнасці і прыхільны жыцця славутага фундатара папулярызуе ксёндз Уладыслаў Завальнюк. Вайніловіч і сёння, амаль што праз стагоддзе, аб'ядноўвае многіх...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Пракаветнае

# У ДРАЎЛЯНАЙ ДУДКІ ЁСЦЬ ДУША

## ЯЕ І ТРЭБА ЎРАТАВАЦЬ!



**Жыхару Салігорскага раёна Хведару Муравейку, які майструе самаробныя дудкі і іграе на іх, будзе нададзены статус захавальніка нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі — пра гэта паведамілі ў Салігорскім метадычным цэнтры. Цяпер рыхтуюцца адпаведныя дакументы на атрыманне ганаровага звання. Муравейка з'яўляецца адным з апошніх захавальнікаў унікальнай традыцыі — вырабу пастуховай дудкі.**



Майстраваць гэты вясковы музычны інструмент ён умее з дзяцінства. Ужо з 12 гадоў яму даводзілася працаваць пастухом замест бацькі. Разам з іншымі хлапчукамі ён рабіў стрэльбачкі з дрэва і дудку пастуха, каб склікаць кароў. А яшчэ часта чуў, як іграюць на інструментах (гармоніках і дудках) мясцовыя музыкі, і спрабаваў іграць сам.

Бацька навучыў Хведара Муравейку, як рабіць клёпкі на бочкі, як правільна выбіраць дрэва, каб было не надта сухім. «Дудка хоча піць», — ласкава кажа ён. Сакрэты, атрыманыя ў спадчыну, майстар выкарыстоўвае і цяпер.

Да таго, як знайсці сваё сапраўднае прызванне, давялося пакаштаваць рознага хлеба — папрацаваць і слесарам-газавіком, і трактарыстам, і шафёрам, і кавалём. Аднак, аднойчы трапіўшы на працу ў вясковы клуб, ён адразу адчуў сябе як рыба ў вадзе — удзельнічаў у народных абрадах, вясковых спевах, выступах музыкаў.

Дударам быў і бацька яго жонкі. Але з асаблівай цеплынёй майстар узгадвае свайго суседа, добрага сябра, які ўжо адышоў


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

у нябыт, Міхаіла Глушана. Яны часам ігралі разам: сусед на самаробнай дудцы, а Хведар — на гармоніку ці ручным барабане, таксама самаробным.

Увогуле майстар лічыць, што сапраўдны мужчына павінен умець усё — печку скласці, збудаваць майстэрню, лазню, зрабіць кошык, бочачку, лесвіцу... А вось інструмент — гэта ўжо справа тонкая, для душы.

Муравейка не ўтойвае сакрэтаў вырабу дудак, гатовы імі дзяліцца: «Палеская дудачка мае даўжыню прыблізна 40 сантыметраў, 7 сантыметраў таўшчыню, і маленькі стрыжань. Першае і самае галоўнае — гэта выбраць сасну з роўным сцяблом. Дрэўцу павінна быць каля 8-10 гадоў. Трэба ссячы яго і падзяліць на 2-3 нарыхтоўкі — каб не было сукоў. Самае складанае — знайсці месца, дзе два дрэвы зрасліся блізка, каб можна было паміж імі ўставіць нарыхтоўку і выкруціць стрыжань. Пасля таго, як ён выкручаны, застаюцца дробязі. Нажом зачысціць ствол ад кары, накаліць на агні шыла, цвік ці палачку і прапаліць дзіркі, зачысціць іх. Дудка — ігравы інструмент пастуха, вось раней яны і рабілі іх прама ў полі ля вогнішча, прапальвалі дзіркі. Яны як кнопкі, якія для гучання націскаюць. Дзірак робяць 6: адну адтуліну, самую апошнюю, глухой, каб пальцы падчас ігры ўпіраліся. Тое месца, дзе трэба дуць, можна абгарнуць плёнкай, а раней пастухі рабілі там берасцяныя замочкі. Рабіць дудкі трэба ў разгар лета. Але аднойчы майстравалі і зімой — таксама ігрaла».

Хведар Муравейка вельмі хоча перадаць сваё майстэрства моладзі, іншым зацікаўленым людзям. Ён ледзь не апошні захавальнік умення вырабляць пастуховыя дудкі. Таксама можа навучыць рабіць ражкі з рога каровы і з вольхі. Аднак вялікай цікавасці да ўнікальных рамёстваў, якія знаходзяцца на мяжы знікнення, ён у іншых не бачыць. Зрэдку прыязджаюць студэнты, запісваюць нешта для сваіх архіваў. «Раней у пастухоў лічылася, што ў драўлянай дудкі ёсць душа, — кажа майстар. — Яе і трэба ўратаваць!»

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Нашы святыні

# НАЙЛЕПШЫЯ Ў СВЕЦЕ МАЗАІКІ І КАВА З ЖАЛУДОЎ

## Карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася з цікавінкамі Свята-Елісавецінскага манастыра

**Дзверы манастырскіх цэркваў адчынены з сямі раніцы да вечара, прыйсці памаліцца сюды можна ў любы час. Тут стаяць свечкі, сядзяць, стаяць, плачуць, разважаюць, нават спяць — ніхто і не падумае папракнуць. Манастыр прымае сотні паломнікаў, якія прыходзяць сюды не толькі для таго, каб пакланіцца мясцовым святыням, раскрыць сваю душу Богу і атрымаць суцяшэнне. Многія тут цалкам мяняюць свой лёс і знаходзяць сапраўдны паратунак — хто ў малітве, хто ў працы, хто ў дапамозе хворым.**



Інтэр'ер Елісавецінскага храма.

### Манастыр на месцы пакут

На 70 дзесяцінах зямлі ў Навінках мінскае земства вырашыла адкрыць працоўную калонію для душэўнахворых. Будаўніцтва яе пачалося ў 1914 годзе, а ў 1918-м, ужо савецкая, яна адкрылася. Пра жыццё калоніі да Другой сусветнай вайны звестак няшмат, аднак вядома, што ў 1941 годзе хворых сагналі ў лазню і зрабілі там газавую камеру...

— Да нас прыходзілі людзі, якія маюць доступ да сакрэтных дакументаў, і сведчылі, што ў палях каля Цнянскага вадасховішча былі і расстрэлы рэпрэсаваных, — расказвае **сястра міласэрнасці Таццяна ХАМЯНКОВА,** якая запрасіла на экскурсію па манастыры.

Гісторыя сястрынства, а потым і манастыра пачалася з таго, што ў 1994 годзе ў пасёлак Навінкі, каб наведаць хворых у Рэспубліканскім цэнтры псіхічнага здароўя, сталі прыязджаць прыхаджанкі Свята-Петра-Паўлаўскага сабора. Ахвотніц несці тут служэнне станавілася ўсё больш, і ў 1996 годзе было створана сястрынства ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы.

22 жніўня 1999 года лічыцца днём нараджэння манастыра: у гэты дзень яго афіцыйна зарэгістравалі, тады ж адбыўся першы пострыг манахінь у гэтых сценах. Цяпер іх тут служыць больш як 100. Працягвае працаваць і сястрынства (дарэчы, адно з самых вялікіх у СНД — больш за 300 сясцёр міласэрнасці).



Уся гэтая прыгажосць зроблена са шкла.

Манахіні жывуць у келлях, размешчаных у карпусах. Даюць зарок бясшлюбнасці, а калі прыйшлі ў манастыр у сталым узросце, стасункі з сям'ёй мінімалізуюцца, іх частату вызначае духоўнік. У манахінь няма сваёй маёмасці, уся яна агульная. Сёстры даюць абяцанне безумоўнага паслушэнства ігумені і духоўніку. У кожнай з насельніц манастыра сваё малітоўнае правіла, якое павялічваецца ў залежнасці ад чына. Апроч таго, манахіні разам з сёстрамі міласэрнасці наведваюць больш за дзве тысячы хворых у рэспубліканскім цэнтры псіхічнага здароўя і іншых установах. Першыя дзве прыступкі ў манастве — працаўніцтва і паслушэнства. Калі на гэтым этапе сястра разумее, што памылілася з выбарам, мае права пайсці з манастыра. Гэтаксама і ў сястрынстве — ёсць пэўны выпрабавальны тэрмін, за які трэба вызначыцца, пойдзеш ты гэтым шляхам ці не...

### Да скону маліцца за забойцу

Сястра Таццяна праводзіць нас у царкву, асвечаную ў гонар святога Мікалая Цудатворца. У памяшканні вялікая колькасць старажытных абразоў, якія падаравалі. Некаторыя абразы — у сярэбрана-залатых акладах. Іх зрабілі з каштоўных прынашэнняў ад удзячных вернікаў за ацаленне ад хвароб. Упрыгажэнняў было так шмат, што ўсе яны не маглі змясціцца на іконах, таму вырашылі пераплавіць іх на аклады.

Мікалаеўская царква адметная тым, што ў ёй чытаецца кругласутачная (за выключэннем богаслужэнняў) малітва за ўвесь свет — «Няўсыпны псалтыр».

Адна з найшаноўных ікон у храме — абраз Божай Маці «Неўпівальная Чаша», пры дапамозе якой многім удалося ацаліцца ад алкагольнай, наркатычнай і іншых залежнасцяў.

З царквы Мікалая Цудатворца, не выходзячы на вуліцу, мы падымаемся ўгору па лесвіцы ў Елісавецінскі храм. Прападобнамучаніца вялікая княгіня Елісавета нарадзілася 151 год таму ў Германіі ў пратэстанцкай сям'і Людвіга IV, герцага Дармштацкага, і прынцэсы Алісы, дачкі англійскай каралевы Вікторыі. Сям'я была шматдзетнай, і хоць жыла багата, дзеці выхоўваліся ў строгасці і пашане да працы. У 20 гадоў Елісавета абвянчалася з князем Сяргеем Аляксандравічам Раманавым, пераехала жыць у Расію і праз сем гадоў вырашыла прыняць праваслаўную веру.

Вялікім ударам для княгіні стала смерць мужа, у карэту якога тэрарыст кінуў бомбу. Елісавета знайшла ў сабе мужнасць літаральна па частках сабраць астанкі Сяргея Аляксандравіча і пахаваць яго. Кожны дзень княгіня прыходзіла на магілу мужа. Больш за тое, яна прыйшла да тэрарыста, прасіла паспавядацца і пакаяцца, бо яму вынеслі смяротны прысуд (які асабіста прасіла імператара адмяніць). Абяцала да скону маліцца за забойцу...

Пасля гэтага свецкае жыццё княгіні стала немагчымым. Яна набыла маёнтак у цэнтры Масквы і стварыла там Марфа-Марыінскі манастыр міласэрнасці, настаяцельніцай якога неўзабаве стала. Аднак ужо наступілі часы бальшавіцкага тэрору, змагаліся не толькі з царызмам, але і з Богам. Па настаяцельніцу прыйшлі ўначы, не далі развітацца з сёстрамі. Пасля — Сібір, закінутая вугальная шахта, куды скінулі княгіню, інакіню Варвару, якая добраахвотна пайшла з ёй на пакутніцкую смерць, пяць князёў з Дома Раманавых і частку прыслугі. У шахту з людзьмі кідалі гранаты, але ніводная з іх не разарвалася. Сведкі тых падзей запэўнівалі, што некалькі дзён з шахты даносіўся малітоўны спеў.

Мошчы княгіні і інакіні атрымалася вывезці з Расіі і пахаваць у Іерусаліме, як марыла вялікая княгіня Елісавета. На той момант прайшло два гады пасля іх смерці. Тленне не кранула іх мошчы, ад іх разліваўся водар ці то лілей, ці то мёду і язміну...

### Пачаць пісаць іконы можа кожны...

Пра манастырскія храмы можна расказваць вельмі доўга. Цэлыя гісторыі маюць не толькі цэрквы, але і многія абразы ў іх. Аднак мы вырашылі зазірнуць у куточкі, якія не навідавоку для звычайнага наведвальніка — майстэрні. Іх тут больш за 30, працуюць у іх людзі як са спецыяльнай адукацыяй, так і без яе. Большасць з майстэрняў адраджаюць царкоўнае мастацтва — іканапісная, іканакладная, швейная, залаташвейная, сценапісная, мазаічная, па апрацоўцы дрэва, металу, шкла...

Храм складана ўявіць без выяў святых, таму найперш сястра Таццяна праводзіць нас у іканапісную майстэрню. Адметна, што фарбы пры напісанні ікон выкарыстоўваюцца толькі натуральныя, іх здабываюць з мінералаў і раслін, як і сотні гадоў таму. Пры манастыры ёсць свая іканапісная школа. Аказваецца, любы, хто мае мінімальны мастацкі досвед і здольны пераступіць праз свой творчы эгаізм, можа прайсці тут навучанне і пачаць пісаць іконы.

— Мы знаходзімся ў працоўным памяшканні найлепшай у свеце мазаічнай майстэрні, — прэзентуе сястра Таццяна наступную славутасць манастыра.

Пра гэты абсалютна не перабольшаны статус сведчыць выйгрыш праекта па ўпрыгожванні сабора Савы Сербскага ў Бялградзе. А гэта ні многа ні мала — чацвёртая па велічыні праваслаўная царква ў свеце! Беларускім майстрам трэба будзе выкласці ў ёй тысячы квадратных метраў мазаікі.

Сама яна, між іншым, выпрабляецца па старажытнай тэхналогіі са смальты, якую драбняць на спецыяльным прыстасаванні — смальтаколе — на кавалкі патрэбнага памеру. Для кожнай будучай мазаічнай выявы складаецца палітра, потым рыхтуецца эскіз, пасля чаго на пластылін набіраецца чарнавік. Яго абгортваюць у плёнку, вязуць на аб'ект, дзе кожны кавалачак смальты ўручную пінцэтам прымацоўваецца да паверхні. Гэта па старажытнай тэхналогіі. Крыху інакш робяць па тэхналогіі сучаснай: мазаіку прыклейваюць спецыяльным клеем пры дапамозе будаўнічай сеткі, і ўжо ў такім «сабраным» выглядзе прывозяць на аб'ект і замацоўваюць.

Прыклад працы тутэйшых майстроў, выкананай менавіта старажытным спосабам, можна ўбачыць на тэрыторыі манастыра — у храме ў гонар Маці Божай Дзяржаўнай. Цікава, што самы далёкі заказ з мазаічнай майстэрні Свята-Елісавецінскага манастыра адправіўся ў Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку.

Пры манастыры дзейнічае праваслаўная гімназія ў гонар прападобнай Еўфрасінні Полацкай, ёсць дзіцячы садок, цэнтр духоўна-творчай асветы, дзе маленькія наведвальнікі займаюцца іконапісам, царкоўнымі спевамі, музыкай, рукапашным боем, шахматамі, харэаграфіяй, тэатральнай дзейнасцю і шмат чым іншым.

А побач з манастырскім комплексам дабудоўваецца Дом паломніка, у якім будзе сталоўка для ўсіх ахвотных і фітабар, у якім прапануюць каву з жалудоў і зёлкавую гарбату.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

■ Аднаўленне

# МОЛІМСЯ ПРА ВЯРТАННЕ ХРАМА

**У Міністэрстве культуры Беларусі далі згоду на аднаўленне разбуранага ў савецкі час касцёла ў цэнтры Віцебска. Прыгожы храм быў пабудаваны ў XVIII стагоддзі. Яго фотаздымак можна ўбачыць на многіх дарэвалюцыйных фота і творах мастакоў мінулага і пазамінулага стагоддзяў. Касцёл знаходзіўся праз дарогу ад Рынкавай плошчы і сімвала горада — ратушы. На яго месцы ў 1980-я гады размясцілі фантан...**

Дарэчы, будынак заўсёды быў каталіцкім храмам і ніколі не перадаваўся праваслаўнай царкве. Касцёл зачынілі ў 1940 годзе. Да Вялікай Айчыннай там працаваў атэістычны музей. Цікава, што сярод музейных экспанатаў захоўваліся мошчы святой Еўфрасінні Полацкай. А каб перакапаць народ, што Бога няма, у касцёле павесілі славуты маятнік Фуко. Рабілі гэта ў якасці дэманстрацыі кручэння нашай планеты... Падчас вайны храм быў не вельмі разбураны. Знішчылі будынак у пачатку 1960-х.

— Каб касцёл у гонар Святога Антонія быў адроджаны, робім крокі. На сёння магу сказаць, што ў Міністэрстве культуры ажыццяўленне гэтай ідэі падтрымалі. Дадзена згода на тое, каб касцёл быў адбудаваны (з нуля. — **Аўт**.). Цяпер на самым высокім узроўні ўлады мы пастараемся атрымаць падтрымку, каб гэты праект быў ажыццёўлены. І молімся, каб гэты прыгожы храм заняў сваё месца там, дзе ён стаяў, — адказаў на пытанне карэспандэнта «Звязды» **епіскап Віцебскі Алег БУТКЕВІЧ.**




Касцёл Святога Антонія.

Пра неабходнасць аднаўляць віцебскія храмы гаварыў яшчэ некалькі гадоў таму тады **старшыня Віцебскага аблвыканкама, цяперашні кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр КОСІНЕЦ.**

Менавіта гэты каталіцкі храм вядомы і тым, што там у 1899 годзе пабываў пісьменнік І.А.Бунін. Ён напісаў пра гэта ў адным са сваіх твораў. «...Як узрушыў мяне арган, калі я ўпершыню (у юнацкія гады) увайшоў у касцёл, хоць гэта быў усяго толькі касцёл у Віцебску!»

Пакуль што зразумела, што аднаўленне гэтага касцёла — справа часу. У больш хуткай перспектыве рэальна даць другое жыццё іншаму храму — у віцебскім батанічным садзе. Узведзеная ў XIX стагоддзі на прыватныя грошы былая капліца была перабудавана. Доўгі час будынак не эксплуатаваўся. І ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце, якому належыць батанічны сад і пабудовы ў ім, вырашылі яго разбурыць. Але гэтае рашэнне адмянілі...

— І я хацеў бы асабіста падзякаваць кіраўніцтву ВНУ, Міністэрству адукацыі і мясцовай уладзе за тое, што разбураць будынак не будуць, — працягнуў епіскап. — Цяпер вядзём перамовы аб яго перадачы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Напярэдадні

# ЦЯПЛО «СТУДЗЕНЬСКІХ ВЕЧАРОЎ»

**Душэўнае цяпло і асалоду гледачам абяцаюць падарыць чатыры канцэртныя праграмы XXVIII Міжнароднага фестывалю «Студзеньскія музычныя вечары» ў Брэсце. Цікава, што за паўтара месяца да пачатку фэсту класічнай музыкі палова білетаў прададзена. Гэта пры тым, што сярэдні кошт квітка набліжаецца да паўмільёна рублёў.**

— Значыць, у Брэсце любяць класічную музыку, чакаюць сустрэчы з ёю — кажа нязменны арганізатар «Вечароў», лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лілія БАТЫРАВА. І паведаміла, што ў горад над Бугам прыедуць музыканты і выканаўцы з 16 краін свету. Некаторыя з іх выступяць упершыню, іншыя паспелі стаць улюбёнцамі брэсцкай публікі. У ліку апошніх — народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў, польская вакалістка Юанна Наўрот, беларускія прымы Таісія Засім, Ніна Залатніцкая, першая флейта оперных тэатраў Італіі — прафесар Антоніа Амендуні. З Італіі таксама далі згоду прыехаць яшчэ чацвёра майстроў оперы.

Своеасаблівай фішкай фестывалю абяцае стаць джаз-квартэт Гары Гутмана з ЗША. Паводле слоў Ліліі Батыравай, эстраду на сцэну «Вечароў» яна адважылася пусціць першы раз за 28 гадоў. Але ж гэта асаблівая эстрада. Гары Гутман падрыхтаваў праграму, прысвечаную творчасці Ганны Герман. Яго канцэрт апрабаваны ў многіх краінах свету, усюды выступленне праходзіла з вялікім поспехам. Джазмены выказалі намер падарыць слухачам сустрэчу з творчасцю незабыўнай Ганны: паралельна з выкананнем песень не рэпертуару яны ўключаць запіс арыгінала. Сапраўды, гэта заяўка на нешта не зусім звычайнае.

Яшчэ не мала разынак утрымлівае афіша міжнароднага фестывалю. Напрыклад, выступленне расійскай дзівы Марыі Максакавай.

Фестываль пройдзе, згодна з даўняй традыцыяй, адразу пасля праваслаўных Каляд. Білеты прадаюцца ў касах драматычнага тэатра і ў распаўсюджвальнікаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Сталічны час

# НА НОВЫ ГОД МІНЧАНАМ ПРАПАНУЮЦЬ ІНТЭРАКТЫЎНАГА ДЗЕДА МАРОЗА

**У навагоднюю ноч у Мінску будуць працаваць 27 пляцовак для масавых гулянняў, а каля Палаца спорту можна будзе ўбачыць музычна-піратэхнічнае шоу, устаноўкі для якога размесцяцца на Востраве слёз.**

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі — начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталіна РУДЗІКАВА распавяла, што сёлета ўпершыню мінчане змогуць мець стасункі з інтэрактыўным Дзедам Марозам. Такая акцыя запланавана падчас традыцыйнага шэсця навагодніх персанажаў, якое адбудзецца 25 снежня, і адкрые праграму гарадскіх мерапрыемстваў па святкаванні Новага года. Шэсце стартуе ў 16.30 ад плошчы Незалежнасці. Дзяды Марозы і казачныя персанажы (каля 800 прадстаўнікоў з усіх раёнаў горада) пройдуць па праспекце Незалежнасці, вуліцах Леніна, Інтэрнацыянальнай і фінішуюць на плошчы Свабоды. Гэтая плошча ў перыяд навагодніх свят будзе пешаходнай.

«У бягучым годзе зменены фармат правядзення парада. Па заканчэнні шэсця мінчанам прадставяць атракцыён 3D-мэпінг на фасадзе канцэртнай залы «Верхні горад». Дарослыя і дзеці змогуць пагутарыць з інтэрактыўным Дзедам Марозам. Такі атракцыён у навагоднія святы мы прапануем упершыню», — удакладніла Віталіна Рудзікава.

Кіроўцы, сачыце за абвесткамі: падчас парада будзе абмежаваны рух на праспекце Незалежнасці.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*




## ДАСТАЛАСЯ НА АРЭХІ

У Магілёве затрыманы беспрацоўны, які рабіў бізнес на сухафруктах

**Малады чалавек арандаваў памяшканне, дзе захоўваў сухафрукты, спецыі і арэхі на суму звыш 383 мільёнаў рублёў. Ніякіх суправаджальных дакументаў, якія б пацвярджалі законнасць іх набыцця, у яго не мелася.**

— Было ўстаноўлена, што грамадзянін, які не быў зарэгістраваны ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, незаконна ўвозіў гэтыя тавары з Расіі і рэалізоўваў іх за наяўны разлік оптам і ў розніцу, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — У гэтым выпадку законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе штрафу да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй тавараў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Оргпищепром» (Продавец):**

**производственный корпус с инв. № 640/С-84599, здание проходного пункта с инв. № 640/С-84600, асфальтное покрытие с инв. № 640/С-87556, забор сетчатый с двумя воротами с инв. № 640/С-87555, расположенные по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Заводская, 1А/1, 1А.**

Часть производственного корпуса с инв. № 640/С-84599 сдается в аренду: 60,9 кв.м по 16.11.2016, 45,0 кв.м по 23.11.2017.

Земельный участок площадью 0,5904 га с кадастровым номером 624650100001001747. Целевое назначение – содержание и обслуживание Слуцкого производственного участка. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 2 136 980 231 бел. руб.**
**Задаток – 200 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Оргпищепром»,* **проводимом 15 января 2016 г.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта: 50% в течение 5 календарных дней с момента подписания договора; 50% в течение 60 календарных дней с момента подписания договора. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **15.01.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 13.01.2016 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.06.2015.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация:**
**8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» 28.12.2015 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями**

***по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевхимволокно»***

| | | Начальная цена продажи с учетом НДС, руб. |
|---|---|---|
| ЛОТ №1 | **Капитальное строение с инв. № 700/С-49068 – Главный корпус ДМТ-2,** общ. пл. 20 455,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 45 | 1 430 538 667 |
| ЛОТ №2 | **Капитальное строение с инв. № 700/С-49089 – Корпус промежуточных емкостей ДМТ-2**, общ. пл. 3084,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 45/32 | 286 552 000 |
| ЛОТ №3 | **Капитальное строение с инв. № 700/С-74544 – Производственные площади прядильно-отделочного цеха № 1 ЗСВ, Производственные площади цеха нетканых материалов № 1,** общ. пл. 49 487,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 45; Вспомогательные сооружения согласно перечня | 8 454 839 094 |
| ЛОТ №4 | **Изолированное помещение с инв. № 700/D-129313 – Помещение изолированное бытового корпуса с медпунктом**, общ. пл. 4860,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105Д-2; Вспомогательные сооружения согласно перечня | 1 039 479 663 |

| | |
|---|---|
| Сумма задатка и расчетный счет для его внесения | **Задаток в размере 5% от начальной цены лота** перечисляется на р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509, получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| Дата, время и место проведения аукциона | 28 декабря 2015 года, 13.00, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29 (офис МОУ Филиал «Центр «Белтехинвентаризация») Окончание регистрации – 24 декабря 2015 года до 13.00 включительно |
| Условие аукциона | Победитель аукциона обязан в течение 2 месяцев со дня регистрации перехода права собственности на капитальное строение выполнить работы по устройству ограждения по периметру приобретенного земельного участка |

*Извещения о предыдущих аукционах были размещены в газете «Рэспубліка» в номерах от 02.07.2015 г., 05.08.15 г., 04.09.15 г., 07.10.15 в газете «Звязда» от 07.11.15, 20.11.2015 г. и 02.12.2015 г.*

**Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (8-0291) 400-394 vel.; (8-029) 624-26-25; bti9@inbox.ru**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О РЕАЛИЗАЦИИ ИМУЩЕСТВА ОАО «БАРАНОВИЧИДРЕВ» НА ПЕРВЫХ ТОРГАХ

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны, факс и элек. почта** | Председатель ликвидационной комиссии Мищук А.М. ОАО «Барановичидрев», Брестская обл., г. Барановичи, п. Восточный, 3 тел. 8-029-6332490 vel.; (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; mischuk_am@mail.ru |
| 2 | **Форма проведения первых торгов Дата, время и место проведения торгов** | Первые торги в форме аукциона (далее по тексту – торги или аукцион). **19 января 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи**, пос. Восточный, 3, административное здание, актовый зал |
| 3 | **Сведения о предмете торгов, место нахождения предмета торгов, порядок ознакомления с ним и цена каждого ЛОТА в рублях Республики Беларусь, без учёта НДС – 20%** | **Лот №1** – турбогенераторная установка ТГ 06С/04-Р13/4,0 (инв. №000027 – для выработки электрической энергии с дальнейшим использованием отработанного пара для технологических и отопительных нужд. Мощность – 600КвТ. Частота вращения ротора-турбины 8000 об/мин. Генератора-1500. Параметры трехфазного тока напряжения – В-400, частота Гц-50. Масса – 12,56 т. Стоимость – **2.791.044.800 рублей** |
| 4 | **Срок возможного отказа организатора от проведения торгов** | Организатор вправе отказаться от проведения торгов по любому из ЛОТОВ в срок не позднее 15.01.2016 года, проинформировав участников торгов, подавших заявление об участии в торгах, об отказе в их проведении |
| 5 | **Сумма шага аукциона** | 5% – от начальной цены лота |
| 6 | **Начальная стоимость лота – СМ. п 3** | **Установлена: в рублях РБ – без НДС – 20%** |
| 7 | **Порядок уплаты цены предмета торгов победителем торгов** | Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в рублях РБ в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов |
| 8 | **Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего расчетного банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка** | 10% от начальной цены лота в рублях РБ. Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи. **Назначение платежа – задаток за участие в аукционе** Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению |
| 9 | **Требования к участнику торгов** | Возмещение победителем торгов расходов по оценке, регистрации капитальных строений и иного имущества, а также по заключению и регистрации сделки купли-продажи и других расходов по проведению аукциона |
| 10 | **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов** | Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, в срок до 14 часов 00 минут 15.01.2016 г. организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: **225320, Брестская обл., г. Барановичи, пос. Восточный, 3.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах |
| 11 | **Возмещение затрат на организацию и проведение торгов** | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Победитель аукциона обязан перечислить на расчетный счет продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения аукциона |
| 12 | **Порядок оформления участия в торгах** | К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный в настоящем извещении срок заявление (с приложением необходимых документов), и внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. **В день проведения аукциона перед его началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные номера** |
| 13 | **Критерии выявления победителя торгов** | Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. **В случае признания аукциона несостоявшимся по какому-то из выставляемых ЛОТОВ в связи с подачей заявления на участие в нем только одним участником, предмет торгов может быть продан этому участнику при его согласии по цене торгов, увеличенной на 5 (пять) процентов** |
| 14 | **Порядок оформления результатов торгов** | Победитель аукциона в день его проведения подписывает протокол о результатах аукциона по каждому из ЛОТОВ. Протокол подписывается в трех экземплярах всеми присутствующими членами комиссии по проведению аукциона и победителем аукциона. Протокол утверждается организатором аукциона в день его проведения |
| 15 | **Срок подписания договора купли-продажи** | После подписания копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов между продавцом и победителем аукциона заключается договор купли-продажи предмета торгов. **Договор купли-продажи предметов торгов (ЛОТОВ) должен быть заключен не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона** |

# КЛЮЧ АД ДВУХ АКІЯНАЎ

## Панамскі канал не мае канкурэнтаў. Прынамсі пакуль

**Завяршэнне рэканструкцыі аднаго з найбуйнейшых гідратэхнічных аб'ектаў свету — Панамскага канала, які злучае Атлантычны і Ціхі акіяны, — зноў адкладваецца. Цяпер у якасці новага арыенціра ўсё часцей называюць красавік наступнага года. Між тым адпаведныя работы тут пачаліся ў 2007-м. Іх кошт спачатку ацэньваўся ў 5,25 мільярда долараў, але ў выніку рэканструкцыя, паводле розных ацэнак, аказалася даражэйшай на $2,3 млрд.**

Штогод праз Панамскі канал праходзіць каля 14 тысяч суднаў і ёсць попыт на павелічэнне і без таго вялікай лічбы. Трафік насамрэч шалёны, а вось прапускная здольнасць даволі абмежаваная. Для таго, каб трапіць з Атлантычнага акіяна ў Ціхі (ці наадварот), спатрэбіцца каля 9 гадзін. Прычым караблі рухаюцца не самастойна, а ідуць на буксіры ў адмысловых цягачоў, якія, дарэчы, на жаргоне маракоў завуцца «муламі». Відавочна, што рэканструкцыя вострa запатрабавана. Таму і было прынята рашэнне пашырыць канал і пабудаваць трэці шлях для буйнатанажных суднаў. У выніку яго прапускная здольнасць узрасце ўдвая — з 300 да 600 мільёнаў тон у год. Здаецца, гістарычная падзея ўжо, што называецца, «на гарызонце».

### ГІСТАРЫЧНЫ БЕСТСЕЛЕР

Цікавая і драматычная гісторыя Панамскага канала нагадвае закручаны бестселер. Яна пачынае свой адлік з XVI стагоддзя, калі іспанец Васка Нуньес дэ Бальбоа першым перасёк Панамскі перашыек і выйшаў да ціхаакіянскага ўзбярэжжа. Так было адкрыта, што тэрыторыя сучаснай Панамы з'яўляецца толькі вузкай палоскай зямлі паміж двума акіянамі. У 1539 годзе іспанскі кароль накіраваў спецыяльную экспедыцыю для вывучэння магчымасці будаўніцтва воднага шляху праз Панамскі перашыек. Але ўзважыўшы ўсе перспектывы «на месцы», даследчыкі пасля пераканалі караля, што гэтую задуму рэалізаваць проста немагчыма.

У першай палове XIX стагоддзя неаднаразова ўзнікалі падобныя планы. У 1814 годзе іспанскія картэсы выдалі дэкрэт пра будаўніцтва канала і мабілізацыю грамадства для гэтых мэт. Але, страціўшы ў 1823 годзе ўсе свае калоніі ў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы, Іспанія адмовілася ад прынаднай ідэі. Цягам наступных 50 гадоў пошукі і папярэднія праекты безвынікова рабіліся амерыканцамі, англічанамі, галандцамі і французамі.

У сярэдзіне XIX стагоддзя Вялікабрытанія і ЗША аспрэчвалі права на ўзвядзенне стратэгічнага аб'екта. Скарыстаўшыся іх супярэчнасцямі, у 1876 годзе французская кампанія атрымала на 99 гадоў канцэсію і выключнае права ўзвядзення канала. Першая рэальная спроба будаўніцтва была распачата ў 1879 годзе пад кіраўніцтвам Фердынанда дэ Лесэпса, дыпламата і кіраўніка праекта Суэцкага канала, які быў адкрыты незадоўга да гэтага — у 1869-м. Але панамскі варыянт аказаўся куды больш складаным заданнем. У 1889 годзе французскі праект збанкрутаваў, паколькі занадта складанымі аказаліся ўмовы — панамскія джунглі са сваімі трапічнымі залевамі, непраходная дрыгва і разам з тым скальныя грунты, паводкі і, што самае страшнае, смяротныя эпідэміі малярыі, жоўтай ліхаманкі, чумы, тыфу і іншых хвароб, ад якіх загінулі каля 20 тысяч чалавек.

У 1904 годзе ЗША прыступілі да пабудовы канала. Спачатку работы вяліся пад кіраўніцтвам грамадзянскіх інжынераў, але з 1907 года будаўніцтва ўзяло на сябе ваеннае міністэрства. Будавалі канал больш за 10 гадоў. Першае судна прайшло праз Панамскі канал 15 жніўня 1914 года, але афіцыйнае адкрыццё адбылося толькі 12 чэрвеня 1920-га, пасля чаго канал фактычна ўступіў у дзеянне. Агульны кошт будаўніцтва Панамскага канала склаў прыблізна 375 мільёнаў долараў. З 1904 па 1913 год у работах бралі ўдзел больш як 56,3 тысячы чалавек, з іх больш за 5,6 тысячы (згодна з бальнічнымі лістамі) памерлі ад хвароб і няшчасных выпадкаў. Першае судна — акіянскі параход SS Ancon — па ніцы канала прайшло 15 жніўня 1914 года, але вялікі апоўзень у кастрычніку перашкодзіў адкрыць рух у тым жа годзе.



Тады за будаўніцтва Панамскага канала ўзяліся Штаты. ЗША былі зацікаўлены ў скарачэнні воднага шляху з портаў Каліфорніі да свайго атлантычнага ўзбярэжжа. Гэты аб'ект меў каласальнае ваеннае значэнне — ён дазваляў практычна імгненна перакідаць флот з аднаго акіянскага басейна ў іншы, што значна павялічвала моц і сусветны ўплыў Штатаў. У 1903 годзе ЗША выкупілі панамскі праект у французаў, забяспечылі Панаме незалежнасць ад Калумбіі, якая не жадала перадаць амерыканцам зону канала, па-сутнасці, у бестэрміновае карыстанне. Пасля чаго быў падпісаны фармальны дагавор з новым панамскім урадам (які прадстаўляў зноў-такі француз Філіп-Жан Бюно-Варылья. Ён быў адным з галоўных удзельнікаў збанкрутаванага першага праекта). У адпаведнасці з ім Панама саступала ЗША пад поўную юрысдыкцыю ўласна канал і тэрыторыі ўздоўж яго трасы шырынёй прыблізна ў 16 кіламетраў. За гэта ЗША выплацілі Панаме 10 мільёнаў долараў і абавязаліся ўносіць арэндную плату за карыстанне атрыманай імі тэрыторыяй — 250 тысяч долараў штогод. Гэта сума пасля некалькі разоў павялічвалася, дасягнуўшы $110 млн у 1998-м.



Панамскі канал доўгія гады заставаўся пад кантролем ЗША. У зоне канала знаходзіліся дзясяткі амерыканскіх ваенных баз, працавала каля 50 тысяч вайсковых і грамадзянскіх спецыялістаў. З часам у Панаме пачалі ўсё больш нарастаць пратэсныя настроі, і ў 1977 годзе быў падпісаны дагавор аб паступовай перадачы Панамскага канала ад ЗША Панаме. Рэальна гэты працэс заняў больш за два дзесяцігоддзі, і канчатковая зона канала перайшла ў валоданне Панамы 31 снежня 1999 года.

### ТРАНЗІТ НА $4 МІЛЬЯРДЫ

Цяпер канал кіруецца дзяржаўным агенцтвам Autoridad del Canal de Panama (ACP). Абслугоўвае яго вялізны штат — больш за 10 тысяч чалавек.

З моманту адкрыцця Панамскага канала праз яго прайшлі больш за мільён суднаў. Напрыклад, летась каналам скарысталася 13481 судна.

Што ж уяўляе сабой адзін з галоўных гідратэхнічных аб'ектаў сучаснасці? Агульная працягласць канала складае 81,6 кіламетра, у тым ліку 65,2 км па сушы і 16,4 км па дне марскіх заліваў. Шырыня канала — 150-305 метраў, мінімальная глыбіня — 12,5 метра.

На Панамскім канале ёсць шэсць ступеняў (па тры на кожным схіле) парных шлюзаў, што дазваляюць прапускаць караблі адначасова ў абодвух кірунках. Даўжыня шлюзавых камер — 305 метраў, шырыня — 33,5 метра. Асноўныя грузы, якія перавозяцца праз Панамскі канал, — нафта і нафтапрадукты, вугаль і кокс, металы і мінералы, хімічныя прадукты.

Глабальнае пацяпленне можа пагражаць адной з асноўных крыніц прыбытку Панамы. Самае важнае цяпер — узвесці ўмацаванні вакол аднаго з найбуйнейшых водных



шляхоў у свеце. Танаж канала плануецца павялічыць — па ім змогуць праходзіць грузавыя судны 366 метраў даўжынёй і 49 метраў шырынёй, што ўдвая больш самых вялікіх караблёў, што ходзяць па канале сёння.

Аднак бліскучая эканамічная будучыня Панамы знаходзіцца пад пагрозай з-за змены клімату і экстрэмальных умоў надвор'я. Паводле звестак Сусветнага банка, толькі з 1982-га па 2008 год у Панаме адбылося 32 буйныя прыродныя здарэнні. Змена клімату, як чакаецца, зробіць Панаму яшчэ больш уразлівай перад стыхіяй; краіну чакаюць паводкі і засухі.

Панама перажывала засуху рэкорднай сілы з-за Эль-Ніньё. У выніку абмежаванага паступлення вады рух суднаў па канале быў абмежаваны. Гэта закранула амаль пятую частку з 14 тысяч суднаў, якія праходзяць па канале штогод, і адбілася на ўсёй глабальнай сетцы паставак. Паводкі таксама пагражаюць руху. У 2010 годзе Панамскі канал бы часова закрыты з-за паводкі і рэкордна высокага ўзроўню вады. Безумоўны ўплыў і на экалогію Панамы, бо патрабуецца 190 млн літраў прэснай вады, каб адзін карабель прайшоў праз шлюзавыя вароты канала.

Праект па пашырэнні Панамскага канала заклікаы зрабіць яго больш устойлівым дзякуючы новым шлюзам. Яны маюць рэзервовыя басейны, 60% вады з якіх будзе адпампоўвацца для паўторнага выкарыстання падчас праходу наступнага карабля. Аднак рэканструкцыя адбываецца не без праблем. Напрыклад, падчас выпрабавання новых шлюзаў былі выяўлены расколіны ў бэльках. Рамонтныя работы будуць завершаны налета ў студзені, паведамляецца ў заяве адміністрацыі Панамскага канала. Як чакаецца, у красавіку 2016 года будзе ўведзена ў эксплуатацыю трэцяя чарга Панамскага канала. Да павелічэння аб'ёмаў суднаходства рыхтуюцца порты ЗША. Напрыклад, у Х'юстане завяршылі ўстаноўку чатырох кранаў вышынёй з 30-павярховы будынак. Павелічэнне аб'ёмаў гандлю азначае з'яўленне новых працоўных месцаў, заявіў кіраўнік адміністрацыі порта.

Эканоміка Панамы, дзе долар з'яўляецца фактычнай асноўнай валютай, — адна з самых дынамічных у Лацінскай Амерыцы. За мінулы год яе валавы ўнутраны прадукт вырас на 10,6 працэнта, перш за ўсё дзякуючы правядзенню работ па пашырэнні Панамскага канал. Ён, дарэчы, з'яўляецца адной з асноў эканомікі Панамы — штогод прыносіць краіне да мільярда долараў (каля 8 працэнтаў ВУП). У найбліжэйшай перспектыве гэты паказчык яшчэ павялічыцца. Чакаецца, што налета бюджэт дзяржавы будзе штогод атрымліваць 2,5 мільярда долараў прыбытку ад канала, а да 2025-га адпаведныя паступленні ўзрастуць да больш чым чатырох мільярдаў.

### «ДУБЛЁРЫ» ПАКУЛЬ У ЗАПАСЕ

Разам з тым магчымасці Панамскага канала не бязмежныя, а аб'ём грузаперавозак расце з года ў год. Нават пасля рэканструкцыі ён не ў стане будзе задаволіць бягучыя патрэбы ў перавозцы грузаў з аднаго акіяна ў другі. Ля ўваходу ў канал стаіць пастаянная чарга з суднаў, месцы ў якой распісаны на месяцы наперад.

Раз ёсць патрэба, то яна павінна быць задаволена. Паралельна пра будаванне ўласных «дублёраў» Панамскага канала задумваюцца і іншыя дзяржавы, напрыклад Нікарагуа. Грандыёзнае будаўніцтва тут распачалося напрыканцы мінулага года. Акрамя ўласна канала і патрэбнай інфраструктуры, тут мяркуецца ўзвесці міжнародны аэрапорт, порты, нафтаправод, а таксама з'явіцца зона вольнага гандлю. Па папярэдніх разліках, канал будзе глыбейшым, шырэйшым і даўжэйшым, чым Панамскі, і дазволіць прапускаць судны ўдвая большага танажу. Заяўленыя параметры канала: да 30 метраў глыбіні, да 530 метраў шырыні і 278 кіламетраў даўжыні, з якіх 105 км — па возеры Нікарагуа.

**Эканоміка Панамы, дзе долар з'яўляецца фактычнай асноўнай валютай, — адна з самых дынамічных у Лацінскай Амерыцы. За мінулы год яе валавы ўнутраны прадукт вырас на 10,6 працэнта, перш за ўсё дзякуючы правядзенню работ па пашырэнні Панамскага канала.**

«Вялікі трансканцінентальны канал Нікарагуа», названы ў прастамоўі Нікарагуанскім каналам, мае ўсе шанцы стаць будоўляй стагоддзя. Нікарагуа — краіна небагатая. ВУП на душу насельніцтва — адзін з самых нізкіх у Лацінскай Амерыцы, карысных выкапняў мала, прамысловасць слабаразвітая. Дзяржаўны доўг Нікарагуа ў пачатку XXI стагоддзя складаў больш як 300 працэнтаў ВУП. Улады Нікарагуа разлічваюць, што грандыёзны праект дазволіць стварыць 40 тысяч працоўных месцаў і падвоіць ВУП на душу насельніцтва. «Адно з галоўных багаццяў Нікарагуа — выгадная геаграфічная пазіцыя. Таму ідэя ўжо даўно насілася ў паветры. Марскія перавозкі ўвесь час растуць. Пярэчанні праекту непатрыятычныя», — сказаў дэпутат нікарагуанскага парламента Хасінта Суарас.

Аднак крытыкі заяўляюць, што канал можа нанесці непапраўную шкоду навакольнаму асяроддзю, і пакуль невядома, ці будзе ён мець эканамічную выгаду. Як піша Financial Times, з'явіліся сумненні наконт таго, што гэты праект коштам каля $50 млрд калі-небудзь удасца ажыццявіць. Спачатку чакалася, што канал будзе цалкам уведзены ў эксплуатацыю ў 2019 годзе. Але з'явілася інфармацыя, што рэалізацыя праекта новага воднага шляху ў Нікарагуа адкладзена прыкладна на год — да канца 2016-га. Як вядома, дазвол на будаўніцтва канала ў 2013-м атрымала ганконгская Hong Kong Nicaragua Development Group (HKND). У HKND не ўдакладнілі, па якіх прычынах адкладваецца правядзенне работ.

Прадстаўнік нікарагуанскай камісіі, што адказвае за будаўніцтва канала, падкрэсліў, што праект спыняецца зусім не з-за недахопу сродкаў, а з-за працяглых тэхнічных узгадненняў. Як заўважыў спецыяліст, камісія і прадстаўнікі HKND праводзяць перамовы з патэнцыйнымі інвестарамі з Азіі, Паўночнай і Лацінскай Амерыкі, а таксама з Еўропы.

Захар БУРАК.

■ Спорт-тайм

# МОЛАДЗЬ ІДЗЕ НАПЕРАД

**Айчынныя біятланісты паспяхова выступаюць на юніёрскіх турнірах, валейбольны «Будаўнік» шосты раз становіцца ўладальнікам Кубка Беларусі, а хакейнае «Дынама» абыгрывае сваіх рыжскіх аднаклубнікаў. Самыя актуальныя спартыўныя падзеі — у штотыднёвым аглядзе «Звязды».**

**1. Другі этап біятлоннага Кубка свету ў Аўстрыі завяршыўся эстафетамі.** Наша зборная дзяўчат у складзе Надзеі Скардзіны, Ірыны Крыўко, Ганны Солы і Дар'і Юркевіч заняла сёмае месца. Беларускі да заключнай восьмай стральбы прэтэндавалі на ўзнагароды па выніках гонкі. Ірына Крыўко і Ганна Сола прабеглі свае дыстанцыі, не саступіўшы на лыжні галоўным фаварытам — Германіі, Італіі, Чэхіі. Ганна Сола не затраціла ніводнага дадатковага патрона на стрэльбішчы і адправіла на заключны этап Дар'ю Юркевіч на чацвёртай пазіцыі. Але промах і адзін дадатковы патрон не дазволілі нашым дзяўчатам апынуцца «ў прызах». Пераможцай у гонцы стала каманда Італіі.

У мужчынскай эстафеце Беларусь прадставілі Уладзімір Чапелін, Юрый Лядаў, Сяргей Бачарнікаў і Дмітрый Дзюжаў. Наша каманда стала 13-й сярод 27. Перамогу ў мужчын атрымалі расіяне.

Нагадаем, трэці кубкавы этап пройдзе з 17 па 20 снежня ў славенскай Паклюцы.

**2. Тым часам у аўстрыйскім Оберцілаху Дар'я Блашко выйграла спрынтарскую гонку** на этапе юніёрскага Кубка міжнароднага саюза біятланістаў (IBU). Яна прабегла дыстанцыю за 14 хвілін 45,20 секунды, не дапусціўшы ніводнага промаху на двух агнявых рубяжах.

Таксама малады беларус Максім Варабей стаў пераможцам мужчынскай спрынтарскай гонкі на гэтым турніры.

**3. Мінскі «Будаўнік» шосты раз выйграў Кубак Беларусі па валейболе сярод мужчынскіх камандаў.** Розыгрыш трафея завяршыўся ў брэсцкім спарткомплексе «Алімп». У фінальнай сустрэчы Кубка сышліся «Будаўнік» і «Заходні Буг»: гэтыя каманды ўжо другі год запар сустракаюцца ў вырашальным паядынку турніру. Як і ў 2014-м, мацнейшымі аказаліся мінчане — 3:1.

Трэцяе месца ў турніры заняў барысаўскі клуб «БАТЭ-БДУ», які абыграў салігорскі «Шахцёр» — 3:1.

**4. Хакеісты мінскага «Дынама» атрымалі другую перамогу запар у выязной серыі чэмпіянату КХЛ.** Спачатку «зубры» былі мацнейшыя за чарапавецкую «Поўнучсталь» 5:0, а пазней перамаглі сваіх аднаклубнікаў у Рызе — 5:3.

Пасля 41-га праведзенага матча ў актыве мінскага «Дынама» 62 ачкі і 8-е месца ў турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі. Два найбліжэйшыя паядынкі мінчане таксама правядуць на выездзе, 22 снежня яны згуляюць у Браціславе супраць «Слована», а 24-га сустрэнуцца ў Заграбе з «Мядзведжам». Пасля ў чэмпіянаце КХЛ наступіць перапынак, звязаны з гульнямі нацыянальных зборных.

**5. Баскетбольны клуб «Цмокі-Мінск» на выездзе буйна прайграў маскоўскаму ЦСКА ў сустрэчы Адзінай лігі ВТБ — 48:92.** Першая чвэрць паядынку засталася за «цмокамі», але «армейцы» здолелі пераламіць ход сустрэчы. Адзначым, што ў 20 матчах сезона масквічы саступілі толькі двойчы.

— Цяжка нешта казаць пра такі матч, ЦСКА не пакінуў нам шанцаў. Магу быць задаволены толькі першай чвэрцю, у якой мы змагаліся, пакуль хапала сіл. Усё ж цяпер у нас з-за траўмаў адсутнічаюць два важныя гульцы, не хапае ратацыі. А ў сустрэчы з такім сапернікам неабходна мець 12 моцных баскетбалістаў, — адзначыў пасля заканчэння сустрэчы **галоўны трэнер «Цмокаў» Ігар ГРЫШЧУК.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# САКРЭТЫ АДКРЫТЫ

## Імёны найлепшых футбалістаў краіны назвалі на цырымоніі «Зорны мяч»

**На свяце, прымеркаваным да закрыцця футбольнага сезона-2015, сабраліся гульцы, трэнеры, ветэраны футбола і іх адданыя прыхільнікі. Тут гучалі віншаванні, павучанні і нават вершы ў выкананні Эдуарда Малафеева.**



Ігар Стасевіч — лепшы футбаліст Беларусі.

Урачыстым прывітаннем адкрыў цырымонію **старшыня асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Сяргей РУМАС.**

— Кажучы футбольнай мовай, наш матч сёння пройдзе на новай арэне, мы ўпершыню сабраліся ва ўтульнай зале пашыранымі складамі нашых камандаў. Я кажу зараз аб прадстаўніках заўзятараў футбольных клубаў, якіх хачу павітаць асобна. Сёння мы праводзім гэты матч без прысутнасці міліцыі, — пажартаваў старшыня, выклікаўшы апладысменты залы.

Таксама ён адзначыў, што сёлетні сезон, як заўсёды, падарыў разнастайную гаму эмоцый. Нягледзячы на тое, што ў гэтым годзе не змянілася тройка лідараў чэмпіянату, сюрпрызаў хапала, у тым ліку і ў турніры першай лігі. Сяргей Румас таксама адзначыў і дасягненні зборнай, падкрэсліў, што нацыянальная каманда выдала добры адрэзак на фінішы кваліфікацыі, абгуляўшы лідара групы і сваіх найбліжэйшых пераследнікаў.

— Радасць перамог і горыч паражэнняў — неад'емная рыса кожнага футбольнага года, але любы матч сканчаецца з канкрэтным вынікам. Вось і сёння па традыцыі мы завяршаем футбольны сезон і вызначаем найлепшых па выніках 2015 года, — завяршыў ён.

Перш, чым перайсці да намінацый, кіраўнікі федэрацыі ўручылі спецыяльныя прызы ветэранам айчыннага футбола. Сярод іх у зале прысутнічалі такія вядомыя ў мінулым спартсмены, як Леанід Гарай, Мікалай Блашко, Эдуард Ціхановіч, Веньямін Арзамасцаў, Міхаіл Цэйцін, Яўген Шунтаў, Юрый Мохаў і іншыя «зоркі» гульні нумар адзін.

Узнагароды ж дзейным футбалістам былі ўручаны ў 15 намінацыях, большасць статуэтак забралі гульцы барысаўскага БАТЭ.

Прыз за **найлепшую інтэрнэт-трансляцыю** футбольных матчаў, заснаваны ў мінулым годзе, па выніках сёлетняга сезона атрымала каманда футбольнага клуба «Слуцк». У намінацыі **«Справядлівая гульня»** найлепшым стаў футбольны клуб «Віцебск». **Прыз глядацкіх сімпатый** прадказальна дастаўся барысаўскаму БАТЭ. У намінацыі **«За волю да перамогі»** прызам было адзначана «Дынама-Брэст». **Найлепшым футбалістам Беларусі па міні-футболе** стаў капітан нацыянальнай зборнай Аляксандр Чэрнік. У намінацыі **«Найлепшы суддзя»** прызам была адзначана брыгада арбітра Віталя Севасцьяніка (яго памочнікі Алег Маслянка і Віталь Малюцін).

**Найлепшым варатаром чэмпіянату Беларусі стаў галкіпер барысаўскага БАТЭ Сяргей ЧЭРНІК.**

— Я вельмі рады і ганаруся знаходзіцца на такой падзеі, мне вельмі прыемна, што сярод годных сяброў, калег выбралі менавіта мяне. У майго поспеху ёсць некалькі складнікаў, і адзін з іх — гэта вера нашага клубнага кіраўніцтва і нашых трэнераў у мяне, дзякуй ім за гэта. Футбольны сезон завяршыўся, таму хацелася б усім пажадаць добра адпачыць і з новымі сіламі і старраннасцю штурмаваць алімпы наступнага года, — адзначыў Сяргей.

**Найлепшым абаронцам чэмпіянату Беларусі стаў Неманья МІЛУНАВІЧ, гулец барысаўскага БАТЭ.**

— Дзякуй за намінацыю! Яна не толькі мая, але і кожнага гульца БАТЭ, трэнера, кожнага чалавека, які працуе з намі, заўзятара. Магу сказаць, што гэта самы лепшы год у маёй кар'еры, у Мінску я адчуваю сябе вельмі добра, як дома.

**Найлепшым паўабаронцам стаў таксама гулец футбольнага клуба БАТЭ Ігар СТАСЕВІЧ. Акрамя гэтага, Ігар атрымаў званне самага лепшага футбаліста чэмпіянату краіны.**

— Вядома ж, хачу падзякаваць за гэтыя намінацыі, за тое, што выбралі мяне. Каб стаць лепшым, трэба гуляць з найлепшымі. Сяргей Чэрнік, Неманья Мілунавіч, якія ўжо атрымалі свае ўзнагароды, гэтаму пацвярджэнне.

**Прыз найлепшага нападаючага па выніках сезона ўручыў, без перабольшання, вялікі форвард, заслужаны майстар спорту Савецкага Саюза, заслужаны трэнер БССР Эдуард МАЛАФЕЕЎ.**

— Перш чым уручыць гэтую ўзнагароду пераможцу — Мікалаю Янушу, я абавязаны сказаць: самым важным у футболе з'яўляецца вынік, але не менш значным з'яўляецца колькасць гледачоў на футбольных матчы. Без іх у футбол гуляць цяжка, таму Мікалаю я зычу забіваць галы, а гледачам — любіць футбол, — адзначыў Эдуард Васільевіч.

Акрамя звання найлепшага нападаючага сезона, **Мікалай ЯНУШ другі год запар атрымаў узнагароду як найлепшы бамбардзір чэмпіянату, і да таго ж — самы карысны гулец.** На яго рахунку 23 балы (15 галоў і 8 вынікowых перадач).

— Я вельмі задаволены і шчаслівы, што ўсё так атрымалася. Гэты прыз можна падзяліць на некалькі частак, таму што са мной была і каманда, і ўрачы клуба, і трэнеры, і ўсё кіраўніцтва. Гэта таксама і іх прыз. А з нагоды звання магу сказаць, што самым лепшым заўсёды быць прыемна, таму я вельмі ганаруся ім, — адзначыў Мікалай.

**Прыз імя Аляксандра Пракапенкі «За футбольны талент і самаададдачу ў гульні за Беларусь» атрымаў футбаліст іспанскай «Малагі» Ягор ФІЛІПЕНКА.**

**Уручэнне ўзнагарод працягнулася вызначэннем найлепшага трэнера Беларусі. Ім стаў Аляксандр ЕРМАКОВІЧ.**

— Вельмі прыемна знаходзіцца на гэтай сцэне. Вялікі дзякуй за ўзнагароду, яе я хачу бы падзяліць са сваімі памочнікамі. Таксама адзначу поўны давер і падтрымку нашага кіраўніцтва. Ну і тут ужо не раз адзначалі барысаўскіх гульцоў: яны перамаглі практычна ва ўсіх намінацыях, ім асобная падзяка, хлопцы правялі выдатны сезон. Найлепшага трэнера робяць самыя лепшыя гульцы, — падкрэсліў Аляксандр Уладзіміравіч.

Фота Надзеі БУЖАН.


Лепшы футбольны трэнер краіны Аляксандр Ермаковіч.

**Завяршылася цырымонія ўручэннем самай прэстыжнай узнагароды — «Зорнага мяча» найлепшаму гульцу Беларусі, ім стаў Ігар Стасевіч.**

Таксама ў рамках закрыцця сезона былі названы сімвалічныя зборныя «А» і «Б». У каманду «Б» увайшлі Аляксандр Гутар (мінскае «Дынама»), Максім Жаўнерчык (БАТЭ), Павел Рыбак («Шахцёр»), Дзяніс Палякоў (БАТЭ), Аляксандр Шагойка («Белшына»), Ненад Адамавіч (мінскае «Дынама»), Арцём Старгародскі («Шахцёр»), Валерый Жукоўскі («Нафтан»), Сяргей Ражок («Белшына»), Мікалай Сігневіч (БАТЭ), Раман Васілюк (брэсцкае «Дынама»).

У каманду «А» трапілі Сяргей Чэрнік (БАТЭ), Умару Бангура (мінскае «Дынама»), Неманья Мілунавіч (БАТЭ), Сяргей Паліцэвіч (мінскае «Дынама»), Філіп Младзеновіч, Ігар Стасевіч, Неманья Нікаліч (усе — БАТЭ), Мікіта Корзун (мінскае«Дынама»), Міхаіл Гардзяйчук (БАТЭ), Мікалай Януш («Шахцёр»), Фатос Бечырай (мінскае «Дынама»).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Адметнае

# ЦЫМБАЛЫ ЗВІНЯЦЬ, ЗАПРАШАЕ ГАРМОНІК








**На здымках:**

➤ *Побач са сталымі майстрамі ў зале былі і тыя, хто толькі пачынае свой шлях у мастацтва.*

➤ *Фестывальная сцэнка ў выкананні саліста-гарманіста.*

➤ *Дырыжыруе прафесар Міхаіл Казінец.*

Дваццаць пяць гадоў — ці вялікі гэта адрэзак часу для фестывальнага руху? Па словах першых і сталых удзельнікаў міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», дваццаць пяць гадоў — нібы адзін дзень, запоўнены творчым пошукам, выступленнямі перад удзячнымі гледачамі. Што датычыцца маладых выканаўцаў, то чвэрць стагоддзя аб'яднала не адно пакаленне здольных музыкаў, спевакоў, танцораў. Еднасць талентаў пацвердзіла ўсенародную папулярнасць аднаго з найстарэйшых і самых адметных фестываляў народнага мастацтва ў нашай краіне.

Самыя лепшыя аматарскія калектывы і індывідуальныя выканаўцы можна ўбачыць на фестывальнай сцэне ў Паставах. З'явілася такая магчымасць у жыхароў і гасцей сталіцы. Гэтымі днямі Беларускі фонд культуры сумесна з Белдзяржфілармоніяй пры падтрымцы Міністэрства культуры правялі гала-канцэрт лаўрэатаў пастаўскага фэсту з удзелам нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.

Філарманічная сцэна рэдка бачыць такое унікальнае, яскравае сузор'е народных талентаў. Тыя, хто выступіў на гала-канцэрце, з'яўляюцца своеасаблівымі прадстаўнікамі больш як 500 аматарскіх калектываў — менавіта столькі іх аб'яднаў фестываль за час свайго існавання. Сталы ўдзельнік — заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, ансамбль народнай музыкі «Паазер'е» з Пастаў — распачаў канцэртную праграму і засведчыў: багатыя музычныя традыцыі жывуць і натхняюць новыя пакаленні.

Асаблівá ўрачыстае гучанне гала-канцэрту надаў удзел у ім народнага артыста Рэспублікі Беларусь, лаўрэата дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесара Міхаіла Казінца. На працягу многіх гадоў ён з найвышэйшай прафесіяналнасцю далучаўся да самых адказных фестывальных спраў. Таму зразумела, што на сцэне гала-канцэрта славуты музыкант і педагог атрымаў самы першы букет кветак.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

■ Цёмнае мінулае

# МЕДЫЦЫНСКАЯ ЗАГАДКА: ХТО АПЕРЫРАВАЎ ЧАЛАВЕКА 3600 ГАДОЎ ТАМУ?

## У назе муміі знайшлі штыфт сучаснага тыпу

**У 1971 годзе ў музей Разенкрэйца, што ў Каліфорніі, прывезлі запячатаны старажытнаегіпецкі саркафаг, усярэдзіне якога ляжала добра захаваная мумія вельмі шляхетнага егіпцяніна.**
**Там больш за два дзесяцігоддзі таму група навукоўцаў зрабіла шакіруючае адкрыццё: амаль 3600 гадоў таму была праведзена хірургічная аперацыя неверагодна высокага для тых часоў узроўню складанасці. У левым калене муміі выявілі артапедычны штыфт даўжынёй 23 сантыметры, зроблены з металу. Ён быў ужыўлены дзякуючы такім найскладанейшым біямеханічным прынцыпам, якія не саступаюць нават самым сучасным тэхналогіям.**

### НЕВЯДОМАЯ МУМІЯ

Калі ў 1970-х работнікі музея Разенкрэйца атрымалі старажытнаегіпецкую труну, яны не ведалі, што ўнутры ўсё яшчэ ляжала мумія. Да ўсяго іншага, даследаванні паказалі, што першапачаткова саркафаг належаў іншай муміі — па імені Юзермонту («моц Монтэ») — а затым, праз многія гады пасля яго смерці, туды паклалі іншую. Тым не менш новая мумія невядомага паходжання стала вядомай пад імем першапачатковага гаспадара саркафага. Аналіз працэдуры бальзамавання паказаў, што «Юзермонту» быў мужчынам з вярхушкі старажытнаегіпецкага грамадства і жыў у часы Новага царства (перыяд паміж XVI—XI ст. да н.э.). Даўжыня муміфікаванага цела — 1,5 м, прысутнічаюць сляды рудых валасоў.


Муміфікаваныя астанкі «Юзермонту».

### ШАКІРУЮЧАЕ АДКРЫЦЦЁ

У жніўні 1995 года прафесар Вілфрэд Грыгз з універсітэта Брыгама Янга, размешчанага ў штаце Юта, разам з групай экспертаў прасвяціў рэнтгенам шэсць мумій (уключаючы мумію Юзермонту) з музея Разенкрэйца. Гэта было зроблена перад тым, як ён прачытаў там лекцыю. Спецыялісты былі ўражаныя, калі рэнтген паказаў, што ў левае калена адной з мумій устаўлены металічны штыфт даўжынёй 23 см.

### СТАРАЖЫТНАСЦЬ АБО СУЧАСНАСЦЬ?

Як паведамляюць прадстаўнікі Універсітэта Брыгама Янга, немагчыма даведацца, ці належаў металічны штыфт да старажытнасці, ужыўшы толькі рэнтген. «Тады я выказаў здагадку, што штыфт быў зроблены не ў старажытныя часы і падумаў, што мы змаглі б даведацца, якім чынам штыфт быў ужыўлены ў нагу, а таксама, магчыма, нават высветліць, як даўно гэтая аперацыя была зроблена, — сказаў Грыгз у дакладзе, апублікаваным універсітэтам. — Я проста падумаў, што гэта цікавая заўвага: «Хтосьці ўзяў старажытную мумію і ўставіў ёй у нагу сучасны штыфт, каб тая не развалілася на часткі».

### РАСКРЫЦЬ ТАЯМНІЦУ

Каб даведацца пра паходжанне штыфта, Грыгз, доктар Рычард Т. Джэксан, хірург-артапед з Прова і доктар Е. Брус Макліф, загадчык аддзялення радыялогіі ў рэгіянальным медыцынскім цэнтры Юты, акуратна прасвідравалі ў косці адтуліну для малюсенькай камеры, каб даследаваць штыфт і ўзяць узоры касцявой тканкі і металу. Група навукоўцаў выявіла сляды старажытнай арганічнай гумы, падобнай да сучаснага клею для касцей, а таксама сляды старажытных тлушчаў і валокнаў тканін, якія (дзякуючы гэтай гуме) усё яшчэ былі трывала зафіксаваныя на месцы. Дадатковыя даследаванні паказалі, што медыцынская працэдура высокага ўзроўню была праведзена ў старажытныя часы, прыблізна 3600 гадоў таму.

### АРТАПЕДЫЧНАЯ ПРАЦЭДУРА ВЫСОКАГА КЛАСА

Група даследчыкаў была здзіўленая тым, што штыфт быў спраектаваны па тых жа прынцыпах, якія выкарыстоўваюць у сучасным свеце для фіксацыі касцей. «Мы захапляемся тым, што ў старажытным Егіпце здолелі стварыць штыфт паводле тых біямеханічных прынцыпаў, якія мы ўсё яшчэ выкарыстоўваем сёння, як, напрыклад, пры жорсткай фіксацыі косці, — кажа доктар Рычард Джэксан. — Гэта перасягнула ўсе нашы чаканні».

Прадстаўнікі Універсітэта Брыгама Янга паведамляюць, што ў штыфта «востры крукападобны канец для лепшага ўжыўлення ў сцегнавую косць — дакладна такія ж біямеханічныя метады выкарыстоўваюцца ў нашы дні. Другі канец штыфта, размешчаны ў галёначнай косці, мае тры «зубчыкі», якія прадухіляюць зрушэнне становішча штыфта ў косці».

### ДА ЦІ ПАСЛЯ СМЕРЦІ?

Усіх мучыла адно пытанне, звязанае з гэтым характэрным адкрыццём: аперацыя была праведзена, калі Юзермонту быў жывы, ці пасля яго смерці?

Поўнае даследаванне выявіла, што пласціну ўсё ж уставілі ў перыяд паміж смерцю Юзермонту і яго пахаваннем. Старажытныя егіпцяне верылі ў фізічнае ўваскрэсенне пасля смерці, у якім цела было сродкам перамяшчэння душы ў замагільным свеце. Такім чынам, страхаванне цэласнасці цела мела велізарнае значэнне. Грыгз таксама дадаў, што егіпцяне верылі: для ўваскрэсення цела і духу было важна пераканацца ў тым, што цела было ў добрым стане.

Гэта першы выпадак аперацыі з металічнай пласцінай, але існуюць і іншыя прыклады клопатаў пра цела перад муміфікацыяй: залечванне ран, праца над зубамі, стварэнне пратэзаў. «Неверагодна, што чалавеку, які стварыў штыфт, прыйшла ў галаву менавіта такая думка, — адзначыў Грыгз. — Той, хто зрабіў гэтую працу, мог проста звязаць часткі нагі разам, мяркуючы, што падчас уваскрэсення яны проста зноў зрастуцца».

«Гісторыя паказвае нам, наколькі развітым на самой справе было старажытнае грамадства, — зрабіў выснову Грыгз. — Часам фанабэрыстасць, уласцівая нашай культуры, перашкаджае нам усвядоміць, што людзі іншых культур, якія жылі ў ранейшыя часы, таксама былі здольныя думаць і ствараць самым узрушальным чынам».


Рэнтген калена Юзермонту паказаў наяўнасць штыфта даўжынёй 23 см.


Пратэз пальца, якому 3000 гадоў; яго прышылі пасля смерці ўладальніка цела. Экспанат знаходзіцца ў каірскім Егіпецкім музеі.

■ Дайджэст

# «ХОБІТЫ» ЖЫЛІ Ў ІНДАНЕЗІІ?

**У пячоры на інданезійскім востраве Фларэс, дзе знайшлі астанкі чалавека-хобіта, якія выклікаюць шмат спрэчак, навукоўцы выявілі раней невядомую залу.**
**Калі і ў гэтым гроце знойдуць косткі іншых Homo floresiensis, антраполагі змогуць канчаткова вырашыць, ці быў фларэскі «хобіт» звычайным чалавекам, якія пакутаваў ад хвароб, ці ж гэта прадстаўнік карлікавага віду людзей.**
**Аб знаходцы коратка распавёў часопіс New Scientist.**

Косткі чалавека фларэскага былі знойдзены ў 2003 годзе ў скальным гроце Ліянг Буа. Сярод мноства астанкаў навукоўцы знайшлі адзін практычна поўны шкілет (LB1), які атрымаў мянушку «хобіт». Да гэтага часу сярод антраполагаў няма згоды ў тым, ці гэта карлікавы від, які ўзнік на аснове Homo erectus ва ўмовах астраўной ізаляцыі, ці LB1 — гэта паталагічны Homo sapiens (пігмей, мікрацэфал). Даследаванне новых астанкаў магло б дапамагчы вырашыць гэтую спрэчку, аднак пошукі ў Ліянг Буа пакуль не маюць вынікаў.

Тым не менш аўстралійскі геолаг Майкл Гэгэн і яго калегі, аглядаючы пячору ў 2006 годзе, знайшлі вузкі праход у далёкім куце. Прайшоўшы па ім, навукоўцы выявілі новы грот — Ліянг Бавах («Ніжняя пячора»), 23 на 24 метры і 5 метраў у вышыню (гэта значыць прыкладна ўдвая меншы за Ліянг Буа). Да сённяшняга часу навукоўцы раскапалі верхнія пласты адкладанняў у новай пячоры. Там знайшліся косткі жывёл і каменныя прылады ўзростам у некалькі тысяч гадоў (верагодна, імі карысталіся ўжо людзі сучаснага тыпу).

Аднак у больш глыбокіх пластах грота навукоўцы спадзяюцца знайсці косткі чалавека фларэскага. Надзею даследчыкам дае тое, што на працягу значнай часткі апошніх 200 тысяч гадоў мясцовым жыхарам было прасцей пранікаць у Ліянг Бавах праз пярэдні ўваход, які цяпер завалены камянямі. Акрамя таго, ніжняя храналагічная мяжа астанкаў з першай пячоры — 100 тысяч гадоў, тады як Ліянг Бавах можа расказаць пра больш старажытнае мінулае і, верагодна, паходжанне фларэскіх «хобітаў».





# НАВУКОЎЦЫ АБЯЦАЮЦЬ ДВА САМЫЯ ГАРАЧЫЯ ГАДЫ

**Метэаролагі з Вялікабрытаніі прагназуюць у найбліжэйшы час істотнае павышэнне тэмпературы на Зямлі. У наступныя два гады ў летні перыяд спякота на нашай планеце будзе самай моцнай за ўсю гісторыю метэаназіранняў.**



Як паведамляе ВВС, спасылаючыся на даклад Нацыянальнага метэабюро Вялікабрытаніі, павышэнне тэмпературы на планеце будзе выклікана працэсамі, якія адбываюцца ў Сусветным акіяне. У прыватнасці, гаворка ідзе аб змене тэмпературы павярхнёвага слоя вады ў экватарыяльнай частцы Ціхага акіяна, калі частка нагрэтай вады перамяшчаецца на ўсход.

Гэты працэс атрымаў назву Эль-Ніньё. Яго цыкл складае каля пяці гадоў і аказвае непасрэдны ўплыў на клімат. Менавіта Эль-Ніньё з'яўляецца прычынай праліўных дажджоў у раней засушлівых рэгіёнах і засухі — у раней дажджлівых. Паваротным момантам для клімату Зямлі стане тое, што сёлета магутны Эль-Ніньё пачаў далучацца да працэсаў, якія адбываюцца ў Атлантычным акіяне. Як чакаюць навукоўцы, гэта значна нагрэе паверхню нашай планеты.

Паводле прагнозу брытанскіх метэаролагаў, такі працэс прывядзе да паводак на захадзе Паўночнай Амерыкі, засух у Інданезіі, Аўстраліі і ў некаторых рэгіёнах Індыі і прынясе гарачае сухое надвор'е ў заходнія вобласці Ціхага акіяна. Нягледзячы на тое, што на большай частцы паверхні Зямлі ў наступныя два гады стане цяплей, лета ў Еўропе, хутчэй за ўсё, будзе халодным, адзначаюць сіноптыкі.

Навукоўцам вядома, што на феномен Эль-Ніньё ўплываюць як натуральныя, так і антрапагенныя фактары. У першую чаргу гэта павышаная канцэнтрацыя вуглякіслага газу ў атмасферы Зямлі. У гэтым годзе пералічаныя фактары ўжо прыносяць несуцяшальныя наступствы. Па звестках метэаролагаў, ліпень 2015-га ўжо фігуруе ў гісторыі метэаралогіі як самы гарачы ў гісторыі. Далей будзе яшчэ гарачэй, запэўніваюць спецыялісты.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | |
